Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ялы прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неаплочаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзяе — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпарэлі пасьперад тэксту 1 р. — к. За радок шпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльныя на 50 проц. даражэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 260 (2448) Аўторак, 13-га лістапада 1928 г.

Плян „ЗЭТ" існуе ў сапраўднасьці.

Францускі генштаб застрашвае буржуазею Парыжу, дамагаючыся таніх парадкам павялічэньня вайсковых крэдытаў і большага часу службы ў войску.—Няўдалая спроба прыкрыцца паліцэйскім хвастом.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎЗБРОЕНАГА ПРЫДУШЭНЬНЯ РЭВАЛЮЦЫІ ПРАВОДЗІЦЦА І Ў ІНШЫХ КРАЁХ.

У нумары «Красной Звезды» ад 30 кастрычніка г. г. былі вымешчаны падрабязнасьці пляну «ЗЭТ», распрацаваныя францускім генштабам і названычыны в органу францускае ваеншчыны „Франс Мілітэр". У нумары ад 28-29 кастрычніка г. г. гэтая газэта недарэчна спрабуе замясьці сьляды ў артыкуле пад загалоўкам «Праўда аб пляне ЗЭТ». Газэта спрабуе давесьці, што генштаб зусім не распрацоўваў пляну, бо гэта не яго справа.

„Генштаб ні пры чым?!"

Вось што піша газэта:

«Зразумела, зусім магчыма, што высокія ўрадавыя асобы, паставўленыя на чале нагляданчоў за грамадзкім парадкам, кланяюцца аб мерапрыемствах, зьвязаных з падтрыманьнем яго, і што яны наладжваюць нарады, каб абмеркаваць гэтыя мерапрыемствы. Мы можам нават заявіць, што гэта менавіта так, не баючыся памыліцца". (Падкрэсьлена намі.—Рэд.).

Далей газэта піша, што ў зьвязку са зьяўленьнем у друку чутак аб пляне „ЗЭТ", розныя газэты ўзьнялі шуміху кожная на свой лад: „Фашысты рыхтуюць рэпрэсіі", „Парыж будзе ва ўладзе паўстаньня", „Хто-ж умяшаецца?". „Значыць маю крамку ня зьбіраюцца барвініць".

«Але на каго-ж нарэшце ўскладзена падтрыманьне ладу? Ня будучы юрыскансультамі, усе дасканала ведаюць, што падтрымліваць парадак—справа міністра ўнутраных спраў. Для гэтае меты ён мае пад сваім загадам паліцыю, жандараў, охранынікаў, пажарных і нават, калі ён прызнае гэта патрэбным, войска, выкліканае ім для гэтае меты.

Пры чым тут генэральны штаб?».

«Але, скажуць іншыя, тым ня менш верна-ж тое, што «генштаб» (заўсёды менавіта ён) намеран яшчэ скараціць гарнізон Парыжу. Вы, якія дзівіцеся гэтаму, паспрабуйце вырашыць наступныя дзьве праблемы:

1. Ліквідуйце палову палкоў, не зьмяншаючы гарнізонаў унутры краю і не паслабляючы аховы граніц.

2. Арганізуйце інтэнсыўнае аднагадовае навучаньне маладых салдат, „маючы пад сваім загадам іх гарнізон" ня пляну Згоды".

«... калі добра тое, што ўсе французы цікавяцца вайсковымі справамі і пераконаны ў неабходнасьці падрыхтаваць абарону сталіцы на выпадак поўстаньня, дык, разам з тым, сумна і сьмешна нагадваць, як некаторыя спрабуюць пераканаць нас у тым, што яны шукаюць і знайшлі вырашэньне".

Маскіроўка.

„Што датычыць нас, дык мы не ганяючыся за надта вялікім, можам пакуль зрабіць наступныя вывады:

1. Ня існуе і ня можа існаваць ваеннага пляну «ЗЭТ».

2. Калі і існуе плян „ЗЭТ", дык ён распрацаван паліцэйскай прафэктурай, якая адзіна адказна за падтрыманьне грамадзкага парадку і якая, калі нават і выкліча на дапамогу ўвесь гарнізон Парыжу, дык усё-ж застанецца адзіна адказнаю за ўжываньне сваіх і выкліканых сіл.

3. Калі прэфэкт паліцыі ня здолее справіцца, дык гэта будзе азначаць, што паўстаньне стала гаспадаром вуліцы, і што абаронцы парадку адкінуты праз бар'ер.

4. Тады будзе абвешчана асаднае становішча. Але нехай будзе плян Z, V ці W, усё-ж прыдзецца ізноў заўладаць Парыжам, пачынаючы з пэрыфэрыі". (Падкрэсьлена намі. Рэд.).

„Абарона проці бальшавізму".

Такім чынам, я ня я, і конь ня мой, а ўсё гэта паліцыя муціць... А між іншым: павялічце крэдыты і аддайце нам моладзь на больш доўгую муштроўку—тады, мілыя крамнікі, можаце быць спакойны,—будзе канкретны плян абароны Парыжу. Тымовы-ж плян распрацован ужо даўно. У часопісі „Рэвю дэ Монд" ад 15-га лістапада 1927 г. зьмешчан артыкул невядомага аўтара (які ўтойвае сваё прозьвішча і падпісваецца трыма зоркамі)—«Абарона проці бальшавізму». Аўтар прапануе цэлы шэраг мер, каб забясьпечыць цывілізацыю і нацыю ад гэтае хваробы. Апрача мерапрыемстваў ідэалёгічнага характару (школы, друк і інш.) ён прапануе і плян ваеннае абароны Парыжу. Плян гэты навішен складацца з наступнага:

„1. З папярэдняга вызначэньня тых кыньцёвых цэнтраў (электрастанцыі, пошта, тэлефон і інш.—рэд.) якія павінны абаранядзе, чаго-б гэта ні каштавала, пакінуўшы на волю лёсу ўсё іншае.

2. У разьмеркаваньні сіл і сродкаў (на выпадак паўстаньня.—Рэд.), пры гэтым гэтае разьмеркаваньне павінна быць зроблена a priori, бо трэба мець на ўвазе, што бязмоўна в пачатках паўстаньня тэлефоны і тэлеграф ня будуць працаваць, а некаторыя з вышэйшых чыноўнікаў будуць арыштаваны (паўстанцамі і такім чынам ня будуць выдаваць загадаў—Рэд.).

3. Што-ж датычыць войск парыскага гарнізону, дык дзе іх загадзя павінны быць загатаваны вельмі дакладныя і простыя загады, у якіх будуць паказаны задачы, ня выклікаючыя ніякіх тлумачэньняў; гэтыя задачы павінны быць лёгкімі, каб не патрабаваць для пачатку ад гэтых уражлівых войск (якая «клапатлівасьць»—Рэд.) такіх патуг, якія маглі-б быць імі ня выкананы (г. зн., паступова ўцягнуць парыскі гарнізон у барацьбу в паўстаўшым жыхарствам, памятаючы, што ў цілулым ён лёгка пераходзіў на бок паўстаўшых.—Рэд.).

4. Што датычыць войск, разьмеркаваных па-за Парыжам, дык для іх павінны быць загадзя падрыхтаваны ня менш дакладныя загады; але ад гэтых войск можна вымагаць большага напружаньня, бо гэтыя войскі будуць больш абаронены ад рэвалюцыйнага ўплыву і, апрача таго, яны будуць ведаць, што ідуць на дапамогу сваім таварышом.

5. Што датычыць грамадзянскіх наглядачоў за парадкам, дык іх роля павінна бынь загадзя вызначана, як гэта было зроблена на выпадак забастовак у Парыжы. Існуюць вышэйшыя навучальныя ўстановы; існуюць таксама шматлікія патрыётычныя арганізацыі, якія, не вагаючыся, падалі-б дапамогу ўраду. Трэба, каб з першых-жа хвілін жукоткі знаходзіліся-б каля мундзіраў.

6. Усё, што зазначалася вышэй, датычыць, галоўным парадкам, Парыжу. Але ёсьць яшчэ правінцыя. Не падыходзіць, каб паўстаньне, прагаспадарыўшы 48 гадзін у Парыжы, зьявілася-б і гаспадаром краю. Тут таксама трэба распрацаваць плян і разьмеркаваць ролі».

* * *

Зьмешчаны вышэй матар'ял не патрабуе асаблівых тлумачэньняў. Ён сам за сябе гаворыць. Недарэчная спроба французкага генэральнага штабу ўтаіць сьляды, як нельга лепш, адхіляецца артыкулам, надрукаваным у часопісі «Рэвю дэ Монд». Характэрна, што распрацоўка відомага пляну „ЗЭТ" не абмяжоўваецца адною Францыяй. У Чэха-Славакіі ў органе Крамаржа «Народні Лісты» зьявілася вялікая перадавіца, у якой разьбіраецца французкі варыянт пляну «ЗЭТ». Газэта папаўняе яго гістарычнымі спраўкамі аб Парыскай Камуне і аб Кастрычнікавым перавароту ў «Петраградзе» і патрабуе ўжыць «аналёгічныя меры» на выпадак камуністычнага перавароту ў Празе.

«Красная Звезда».

Дзесяты дзень рурскага лёкауту.

Рабочыя абралі цэнтральны к-т барацьбы.

Саюз між лёкаутаваньнымі мэталёўцамі і бастуючымі суднабудаўнікамі.

500.000 БЕСПРАЦОЎНЫХ НА РЭЙНЕ.

БЭРЛІН, 10-11. Учора ў Эсэне адбылася канфэрэнцыя камітэтаў кіраўніцтва барацьбою лёкаутаваных мэталёўцаў у Рурскай і Вэстфальскай вобласьцях. Прысутнічала 60 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 60 тысяч лёкаутаваных рабочых, на чале в прадстаўнікамі камітэтаў барацьбы на прадпрыемствах Крупа і „Бохумскэга аб'яднаньня прадпрыемстваў сталёвае прамысловасьці". Канфэрэнцыя цалкам ухваліла прапанову рэвалюцыйнае прафсаюзнае меншасьці, абрала цэнтральны камітэт барацьбы і зьвярнулася да гарнякоў, транспартнікоў і рабочых камунальных прадпрыемстваў з заклікам далучыцца да барацьбы мэталёўцаў. Канфэрэнцыя заклікае нямецкую рабочую клясу падаць дапамогу лёкаўтаваным.

Выступіўшы на канфэрэнцыі прадстаўнік бастуючых гамбурскіх суднабудаўнікоў зазначыў, што саюз між будаўнікамі і мэталёўцамі ўжо практычна існуе.

У Эсэне, Дусэльдорфе, Бохуме і Гельзэнкірхэне ізноў адбыліся наладжаныя нямецкай кампартыяй масавыя мітынгі і дэманстрацыі ў гонар 11-ае гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі, за патрабаваньне рэвалюцыйнае прафсаюзнае меншасьці і проці здрадніцкай нямецкае рэвалюцыі (в прычыны 10-е гадавіны скасаваньня манархіі).

БЭРЛІН, 10-11. У сучасны момант патушаны ўсе 60 доменных печаў Рэйнска-Вэстфальскае вобласьці, якія працавалі да лёкауту і складалі дзьвы трэці нямецкіх доменных печаў. Колькасьць беспрацоўных у Рэйнска-Вэстфальскай вобласьці разам в лёкаўтаванымі ўжо перавышае 500 тыс.

Барацьба ў нямецкай жалезаробчай прамысловасьці пачынае адбівацца і на працы Ротэрдамскага порту (Галандыя), бо нямецкія жалезаробчыя прадпрыемствы далі загад затрымаць у Ротэрдаме ўсю прысланую на іх адрас жалезную руду.

СКЛАД НОВАГА ГАБІНЭТУ ПУАНКАРЭ.

ПАРЫЖ, 12-XI. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Склад новага францускага ўраду, складзенага Пуанкарэ, такі: прэм'ер, без партфэлю—**Пуанкарэ** (рэспубліканскі саюз), міністр фінансаў—**Шэрон** (група Лушэра), юстыцыі—**Барту** (рэспубліканскі саюз), замежных спраў—**Брыян** (рэспубліканскі сацыяліст), унутраных спраў—**Тард'е** (умерана-правая групоўка „левых рэспубліканцаў"), вайсковы—**Пэнлевэ** (рэспубліканскі сацыяліст), марскі—**Лейг** (умерана-правая групоўка «левых рэспубліканцаў»), авіяцыі—**Лёран Эйнак** (радыкальная левая група Лушэра), гандлю—**Бонзфу** (правы рэспубліканска-дэмакратычны саюз), грамадзкіх работ—**Форжо** (рэспубліканскі сацыяліст), працы—**Лушэр** (радыкальная левая), асьветы—**Маро** (сэнатар, уваходзіць ва ўмераную цэнтрысцкую групу, так званую «дэмакратычную левую»), калёній—**Мажыно** (правая група дэмакратычнага дзеяньня), земляробства—**Энэсі** (рэспубліканскі сацыяліст) і інш.

У нова-складзены габінэт Пуанкарэ ўвайшло 9 сяброў папярэдняга габінэту. У зьвязку з выхадам радыкалаў з ураду, самаю леваю буржуазнаю групоўкаю ў новым урадзе зьяўляецца партыя рэспубліканскіх сацыялістаў, якая мае пяць партфэляў; з цэнтрысцкіх груп ва ўрадзе прадстаўлены група Лушэра, якая мае тры партфэлі і сэнацкія групоўкі „рэспубліканскі саюз" і дэмакратычная левая". Іншыя міністры, якія ўваходзяць ва ўрад, зьяўляюцца прадстаўнікамі умерана-правых груповак.

КАНФЭРЭНЦЫЯ АБ РАЗБРОЕНЬНІ ІЗНОЎ ЗРЫВАЕЦЦА.

ПАРЫЖ, 10-XI. Газэта «Эвр" паведамляе, што старшыня падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні Лёўдон прапануе Бонкуру ў выкананьне верасьнёўскае рэзалюцыі Лігі Нацый, склікаць 21-га студзеня 1929 году падрыхтоўчую камісію да канфэрэнцыі аб разброеньні. Бонкур глядзіць на прапанову адмоўна, спасылаючыся на тое, што выпрацаваць канэнцыю аб скарачэньні ўзброеньняў перашкаджаюць сур'ёзныя палітычныя цяжкасьці, якія выплываюць з нездаволеньня марскіх дзяржаў англа-францускаю марскою згодаю. Як паведамляе газэта, Бонкур непакоіцца, што пры такіх умовах «расейцы і немцы пагрэюць рукі на новай бескарыснай сэсіі камісіі аб разброеньні".

Новы румынскі ўрад

З ВОСТРАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ АФАРБОЎКАЙ.

ВЕНА, 10-XI. Водпуг паведамленьняў з Бухарэсту, пасьля няўдалых спроб скласьці ўрад „нацыянальнае канцэнтрацыі» Тытулеску адмовіўся ад узятага на сябе даручэньня скласьці новы габінэт.

Водпуг яго прапановы, рэгенцкая рада даручыла складаньне новага габінэту лідэру нацыянальна-сялянскае партыі Маніу. У часе прыёму Маніу рэгенцкай радай перад палацам, дзе адбываўся прыём, вышлося каля 20 тысяч чалавек, якія дэманстравалі за заснаваньне габінэту нацыянальна-сялянскае партыі.

* * *

ВЕНА, 10-XI. З Румыніі паведамляюць, што рэгенцкая рада зацьвердзіла складзены Маніу сьпіс міністраў. Новы габінэт, прэм'ерам якога зьяўляецца Маніу, складаецца выключна з сяброў нацыянальна-сялянскае партыі. Міністры ўжо сёньня далі прысягу. Міністр замежных спраў—прафэсар Міранескі.

Габінэт Маніу-цацка ў руках Англіі.

ВЕНА, 10-XI. Як паведамляюць з Белграду, румынскія палітычныя колы думаюць, што лібералы ў апошні момант саступілі ў зьвязку з рашучым напорам Англіі на нарысьцы Маніу (нацыянальна-сялянская партыя). Перадаюць, што ў якасьці кампэнсацыі за паводзіны лібералаў Маніу нібыта абавязаўся не рабіць вострых зьмен у фінансавай, эканамічнай і замежнай палітыцы. На думку друку, урад у пытаньнях замежнае палітыкі будзе прытрымліваца англа-французкае арыентацыі, а таксама шукаць зблізканьня з Нямеччынай і Вэнгрыяй. Што датычыць адносін да СССР, дык поўныя вочкава-палітычныя фантазы сьведчаць аб магчымасьці пашырэньня базісу вайсковага саюзу в Польшчаю.

СУД НАД ТАВ. МАРТЫ.

ЗА АРТЫКУЛ У АБАРОНУ СССР.

ПАРЫЖ, 10-XI. У папраўчым судзе (ён разглядае справы бяз удзелу прысяжных засядацеляў) разглядалася ўчора справа ранейшага камуністычнага дэпутата Марты, які абвінавачваўся «у закліку вайскова-служачых да непаслухмянасьці». Прычэпкаю да гэтае справы быў артыкул Марты накант гутаркі маршала Фоша, накіраванае проці СССР.

Марты заявіў, што яго адказ на гутарку Фоша быў для яго выкананьнем абавязку камуністычнага дэпутата і ўдзельніка чорнаморскага паўстаньня 1919 г. (у французкім флёце). „Калі заўтра,—сказаў пры гэтым Марты,—ізноў пасьмеюць напасьці на савецкую дзяржаву, дык мы ізноў выступім на яе абарону, як зрабілі гэта у 1919 г.». Потым Марты выказаўся проці складу суду. З яго думкаю згадзіліся, і справа адкладзена на месяц.

Дэманстрацыя ў Эльзасе проці Францыі.

ПАРЫЖ, 10-XI. У Страсбурзе адбыўся мітынг пратэсту проці пазбаўленьня Рыклена і Росэ дэпутацкіх мандатаў. Пасьля прамоў удзельнікі мітынгу нападзілі дэманстрацыю, якая была разагнана паліцыяй. Арыштавана некалькі ўдзельнікаў дэманстрацыі.

БАЛЬДВІН АБЯЛЯЕ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫ АКТ.

ЛЁНДАН. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што на банкеце лёрд-мэра Бальдвін заявіў: «Англа-французкае супрацоўніцтва ня можа пашкодзіць якой-небудзь іншай дзяржаве. Пашырэньне гэтага супрацоўніцтва павінна стаць падмуркам для эўрапейскага будынку. У гэтым палітыка ангельскага ўраду».

Штрэзэман вярнуўся да працы.

БЭРЛІН, 7-XI. Агенцтва Вольфа паведамляе: „Штрэзэман пасьля доўгага водпуску распачаў выконваць сва. абавязкі".

ІЗНОЎ АНТЫСЭМІЦКІ ПАГРОМ.

БУДАПЕШТ. У Будапешцкім вэтэрынарным інстытуце здарыліся новыя антысэміцкія непарадкі. На студэнтаў-яўрэяў наскочылі фашысты, пусьціўшы ў ход каменьні і кіі.

Антыпольскія дэманстрацыя ў Коўні.

«Кур'ер Віл.» (№ 256) паведамляе, што ўначы з 6 на 7 лістапада нацыяналістычная літоўская моладзь вывесіла на вул. Вольнасьці ў Коўні цэлы шэраг транспарантаў з надпісамі, заклікаючымі разарваць перагаворы з Польшчай і не ўваходзіць з палякамі ні ў якія зносіны, пакуль Літва не адбярэ Вільні.

МАСАВЫЯ ВОБЫСКІ Ў ЗАГРЭБЕ.

ВЕНА, 10-XI. Водпуг паведамленьняў з Белграду, учора ў Загрэбе паліцыя ўчыніла вобыскі ва ўсіх асоб, якія, водпуг яе заявраньняў, удзельнічалі 7-га лістапада ў дэманстрацыі ў гонар 11-тых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі. Аб выніках вобыскаў паліцыя не паведамляе нічога; загрэбскі друк заявляе, што гэта тлумачыцца тым, што вобыскі не далі ніякіх вынікаў.

КАЛЮМБІЯ ЗМАГАЕЦЦА З ІМПЭРЫЯЛІЗМАМ ЗЛУЧ. ШТАТАЎ.

НЬЮ-ЁРК, 10-XI. З Баготы (Калюмбія) паведамляюць, што сэнат зацьвердзіў далучэньне Калюмбіі да пакту Келёга з агаворкаю, што Калюмбія пакідае за сабою права змагацца проці інтэрвэнцыі, проці акупацыі мытных партоў дзяржаў-завінавачаных і г. д.

Агаворкі непасрэдна датычаць учынкаў, вядомых для палітыкі Злучаных Штатаў у Лацінскай Амэрыцы.

АБРАНЬНЕ ГУВЭРА НЕ ПА СЭРЦЫ ПІЛЬСУДЧЫКАМ.

БОЯЗЬ АМЭРЫКАНСКА-САВЕЦКАГА ЗБЛІЖЭНЬНЯ Ў ВАРШАВЕ.

ВАРШАВА, 10-XI. Друк аддае шмат увагі абраньню Гувэра прэзыдэнтам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў. Камэнтары газэт значна разыходзяцца ў ацэнцы таго, як адаб'ецца абраньне Гувэра на міжнародным становішчы Польшчы. Газэта «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» падкрэсьлівае, што кандыдатуру Гувэра энэргічна падтрымліваў сэнатар Бора, які ня раз выступаў за прызнаньне СССР урадам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў. Газэта баіцца зблізканьня Паўночна-Амэрыканск. Злучаных Штатаў з Нямеччынай і СССР і зазначае, што Польшча павінна піль на сачыць за разьвіцьцём палітыкі Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў пасьля абраньня Гувэра прэзыдэнтам.

Камісія сойму па замежных справах адхіліла прапанову дэпутата Левэнгерца аб пасылцы Гувэру прывітальнае тэлеграмы.

РЭПРЭСІІ ПРОЦІ ЮГАСЛАЎСКАЕ ПАРЛЯМАНЦКАЕ АПАЗІЦЫІ.

ВЕНА, 10-XI. З Белграду паведамляюць, што югаслаўскі ўрад пераходзіць на шлях абвастрэньня рэпрэсій проці сялянска-дэмакратычнае каліцыі (блёк апазіцыйных партый, якія байкатуюць парлямант сучаснага складу). Белградзкія газэты, дзе зьмяшчаліся заявы лідэраў каліцыі, падпарадкаваны ўзмоцненай цэнзуры. Проці Мачэка, Прыбічэвіча і іншых лідэраў каліцыі ўзьнімаецца судовая справа бо, згодна заявы міністэрства ўнутраных спраў, «яны парушылі законы сваімі прамовамі і заявамі, агалошанымі ў друку». У палітычных колах лічаць, што гэтая палітыка рэпрэсій проці каліцыі распачата ўрадам з прычыны наўдачы яго спроб дамагчыся згоды з каліцыяй.

У Саюзе ССР.

42.000 капальнікаў на 6-цігадзінны дзень.

АРЦЁМАЎСК. З 1-га кастрычніка пераведзена на 6-цігадзінны працоўны дзень 35-ці процантаў усіх вугольных капальняў акругі. На гэтых капальнях занята блізка 42-х тысяч рабочых.

88 міліёнаў на кватэры рабочым.

МАСКВА. Цэнтральны камунальны банк распрацаваў плян крэдытаваньня кватэрнага будаўніцтва прамысловасьці на 1928-29 год. Агульная сума крэдыту на пабудову кватэр для прамысловых рабочых складае 88 міліёнаў рублёў. Беннінавугольная прамысловасьць атрымае 24 міліёны, мэталёвая—блізка 17-ці, хімічная—3. Апрэ таго, рэспубліканскай, а таксама мясцовай прамысловасьці выдаецца блізка 15-ці міліёнаў рублёў. Цэнтральны камунальны банк распачаў выдачу авансаў для загатоўкі будаўнічых матар'ялаў

Турксіб штодня даўжэе.

СЕМІПАЛАЦІНСК, 10-XI. Пракладка шляху ў паўночнай частцы Турксібу (Туркестана-Сібірскае чыгункі) ідзе ранейшым тэмпам, не зважаючы на настаўшы ў апошні час холад. У сярэднім пракладаецца за дзень 2 з паловаю кілёмэтры. Ужо пракладзена 265 кілёмэтраў. Іншая праца паступова згортваецца. Узімку разгорнецца шырока будаўнічая праца па цывільных пабудовах.

У Маскву едзе амэрыканскі фінансіст Дзюі.

ВАРШАВА, 10-XI. У палітычных колах выклікала некаторае замяшаньне паведамленьне аб надыходзячым падарожжы амэрыканскага фінансавага наглядальніка Дзюі ў Маскву. Дзюі выяжджае з Варшавы ў Маскву ў панядзелак.

Агляд чырвонае казармы.

МАСКВА. Згодна загаду Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету абвешчан агляд чырвонае казармы. Агляд павінен вывяліць бытавыя ўмовы чырвонаармейцаў, намеціць шэраг практычных захадаў для ўдасканаленьня казарм і заснаваньня ў іх культурнага быту. Агляд пачнецца 1-га студзеня і скончыцца да 11-х угодак Чырвонае арміі. Лепшыя чырвонаармейскія часьці будуць прэміраваны.

Моладзь папаўняе камсамол і партыю.

АРЦЁМАЎСК. У зьвязку з 10-цігодзьдзем ЛКСМ на акрузе ўвайшло ў ЛКСМ 2.350 маладых рабочых. У партыю прададзена 600 камсамольцаў.

Катастрофа ў кіно-тэатры.

ВАРОНЕЖ, 10-XI. На ст. Хадынец у часе кіно-сэансу загарэлася істужка. Апарат быў адгарожан ад залі драўнянаю пераборкаю. Агонь шпарка ахапіў усю залю, у якой было шмат дзяцей. Механік з памоцнікам выскачылі праз вакно. Бацькі, якія чакалі дзяцей каля тэатру, кінуліся ратаваць іх і закуркавалі сабою выхады. Пажарныя прыехалі з вялікім спазьненьнем. Тэатр згараў дашчэнту. Есьць шмат ахвяр. На пажарышчы знойдзены абгарэўшыя трупы. Лік ахвяр яшчэ не ўстаноўлен.

Сьвятыя распусьнікі.

БАКУ, 12-XI. Сёньня распачаўся працэс бакінскага біскупа Арсенія і групы папоў мясцовых цэркваў, абвінавачаных у згвалтаваньні недарослых і ў мужалоцтве. Па справе прыцягнута да адказнасьці 15 чалавек. Біскуп Арсеній і папы Вырытаеў і Сурын абвінавачаны ў згвалтаваньні недарослых і мужалоцтве. Поп Малышкін абвінавачваецца ў тым, што ён трымаў прытулак распусты пры царкве. Большасьць абвінавачаных на папярэднім дазнаньні сазналася ў сваіх злачынствах. У матар'ялах абвінавачэньня ёсьць даныя аб злачынных оргіях і распусьце

Чырвоны Кастрычнік у Манголіі

УЛАН БАТОР, 7-XI. Сьвяткаваньне 11-х угодак Кастрычніка распачалося 6-га кастрычніка ўрачыстым пасяджэньнем, у якім удзельнічалі дэлегаты зьезду мангольскае народнае партыі, атаксама прадстаўнікі ўраду, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. 7-га раніцаю адбыўся парад часьцей мангольскае народнае арміі і працэсія арганізацый.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Цікавы выпадак з былым паслом Валошыным.

Ня так даўно адміністрацыя турмы ў Равічах, дзе знаходзіцца былы посол Валошын, абвясьціла яму, што ён звольнен з турмы. Калі зьдзіўлены Валошын запытаўся: «На якой падставе"—дык яму адказалі: «Не разважаць і хутчэй апранацца».

У канцэлярыі турмы яму перадалі дакументы аб звальненьні. Лічачы тое, што рабілася за галюцынацыю, Валошын яшчэ запытаўся: «А як-жа з маімі сябрамі, ці яны таксама будуць звольнены»? Яму таксама і тут адказалі: «Не разважаць». Не разумеючы да канца ў чым справа і не жадаючы папасьці ў нейкую пастку, Валошын заявіў, што ён без сваіх сяброў з турмы ня выйдзе. Адміністрацыя мусіла званіць у Вільню і даведацца ў чым справа.

Пасьля выясьненьняў, Валошын застаўся ў турме. Як перадаюць, выясьнілася, што за паслом Валошыным, апрача агульнае справы, лічыцца шмат і драбнейшых спраў. Як відно, за адну з гэтых спраў Валошын адбыў кару і суд, відаць, забыўшыся, што справа ідзе аб пасьле Валошыне, чуць ня звольніў яго.

Банда з ручным кулямётам.

Польская прэса паведамляе, што ў Пастаўскіх лясох пакінілася банда, маючая ручны кулямёт.

Складаецца яна, быццам, з некалькіх дэзэртыраў, пад камандаю дэзэртыра з аднаго з віленскіх палкоў нейкага Антуха.

Літоўская прэса аб канфіскатах беларускай радыкальнай прэсы.

19 нумар выходзячага ў Вільні літоўскага 2-х тыднёвіка «Жыцьё народу» зьмяшчае заметку, што «ўжо ўсе прывыкілі да сыстематычнага канфіскаваньня органу беларускіх радыкалаў, які ўжо зьмяніў столькі назоваў, што сапраўды нявядома, які яго чародны назоў. Аднак, «Гродзкае Староства» не пазбавае жартаваць і «Маланцы», якая таксама пачалася часьцей шых канфіскатаў.

Новая партыя асаднікаў.

Міністэрства зямельных рэформаў прыгатавала надзяленьне зямлёй вайсковых інвалідаў у паветах; Віленска-Троцкім, Ашмянскім, Сьвяцянскім, Браслаўскім, Пастаўскім, Дзісьненскім, Вілейскім, Маладэчанскім, Валожынскім і Лідзкім. Гэты праэкт будзе прадстаўлены дзеля разгляду і зацьвердженьня на пасяджэньні рады міністраў, якая мае адбыцца на гэтым тыдні. Калі гэты праэкт зацьвердзяць, дык хутка новая хваля асаднікаў пацыпе сеянь „культуру".

Злавілі шпіёнаў.

„Кур. Віл." (№ 256) паведамляе, што каля Сувалак паліцыя арыштавала на абвінавачаньні ў шпіёнажы на карысьць Літвы 3 асобы, якія быццам рабілі топаграфічныя здымкі і зьбіралі даныя аб раскватаваньні войска.

Беспрацоўе ў Вільні.

Па апошніх статыстычных даных лік беспрацоўных у Вільні раўняецца 2382 асобам, у тым ліку мужчын—1604 і жанчын—778. У параўнаньні з папярэднім тыднем, беспрацоўе ў Вільні павялічылася на 80 асоб.

„Саха", № 8.

Выйшаў з друку ў Вільні № 8 гаспадарчага месячніка «Саха» з вельмі багатым, як піша «Бел. Крыніца», зьместам і пры гэтым дадае: «Радзім нашым чытачам выпісаць гэты месячнік, які займаецца толькі чыста гаспадарчымі справамі»

Зьезд старостаў Новагрудзкага ваяводзтва.

Як паведамляе «Кур. Віл.» (№ 250), 30 кастрычніка г. г. у Новагрудку пачаўся зьезд старостаў Новагрудзкага ваяводзтва. У нарадах прымаюць таксама ўдзел: пракуроры Пікулускі і Ходэцкі, прадстаўнік школы куратарыуму Младкоўскі і начальнікі аддзелаў ваяводзтва. На нарадку дня—гаспадарчыя і асьветныя справы. Нас цікавіць, якія адносіны маюць гэны пракуроры да асьветных і гаспадарчых спраў. Штось-ці тут ня так.

Канфіскацыі.

„За Працу" (№ 2) паведамляе, за што былі сканфіскаваны нумары «Слова Працы» і № 1 „За Працу".

Па загаду гарадзкога старасты сканфіскаваны № 7 газ. «Слова Працы» за 1) перадавіцу «Полярызацыя сілаў», 2) артыкул—„Пад клясавым штандарам", 3) артыкул—„Дзесяць галоў", 4) за заметку—«З сялянскай забаст. у Трочэне».

№ 8 газэты «Слова Працы» сканфіскаваны за 1) перадавіцу «Да апошніх падзеяў у Віленскай Беларускай Гімназіі», 2) фэльетон—„Маленькія, але разумныя" і 3) карэспандэнцыю—«З т-ва Беларускай школы».

№ 9 газ. „Слова Працы" сканфіскаваны за 1) перадавіцу «Хто вінаваты», 2) верш. М. Васілька—„За родную школу", 3) артыкул—„Эўропа гуляе ў разброеньне", а Кітай узмацняецца і 4) заметку з нашай хронікі пад загалоўкам „Вынікі неадбытага зьезду".

Па загаду гарадзкога старасты на места Вільню таксама сканфіскаваны № 1 газ. «За працу» за 1) перадавіцу «Беларуская Акадэмія Навук», 2) заметку з нашай хронікі «Прыгавар над студэнтамі» і 3) за заметку „Канфіскаты".

* * *

Віленскі гарадзкі староста сканфіскаваў № 50 „Беларускай Крыніцы" за артыкул «Хворан справа».

СЬВЯТА КАСТРЫЧНІКА У БЕЛАРУСІ.

Дзень агляду дасягненьняў.

(Ліст з Бабруйску).

Сьвяткаваньне Кастрычніка Бабруйск распачаў шостага лістапада. Вечарам горад заіскрыўся тысячамі рознакаляровых агней ілюмінацыі, апрануўся ў сьвяточную вопратку чырвоных лёзунгаў і сьцягаў.

Даволі шырокія вуліцы гораду былі запружаны народам. Гэта было ўзапраўды масавае, узапраўды народнае, узапраўды грандыёзнае гуляньне.

Клюбы ў гэты вечар кішэлі народам. Працоўныя Бабруйску слухалі даклады аб 11 гадавіне Кастрычніка, спраўлялі вечары, весяліліся, сустракаючы вялікае сьвята.

Раніцою 7 кастрычніка, ня гледзячы на кепскае надвор'е, працоўныя Бабруйску дружна зьбіраліся на дэманстрацыю. Пад гукі музыкі арганізацыя за арганізацыяй падыходзіла да асяродку збору—дому саюзаў і адтуль стройнымі калёнамі працоўныя рушыліся пад гукі музыкі і песьняў па гораду і за горам, каб там разам з Чырвонай арміяй вітаць сьвята Кастрычніка.

Тут адбыўся кароткі мітынг. Выступаўшыя таварышы ў кароткіх словах гаварылі аб дасягненьнях нашых да 11 гадавіны Кастрычніка, гаварылі аб чарговых задачах, віталі Чырвоную армію і працоўных Бабруйску з сьвятам. У адказ на прывітаньні з грудзей прысутных неслася дружнае ура!

Парад Чырвонай арміі дэманстраваў перад працоўнымі моц і арганізаванасьць арміі, яе дысцыплінаванасьць, яе дасягненьні да 11 гадавіны Кастрычніка. Вечарам 7 лістапада ў клюбах таксама адбыліся вечары, прысьвечаныя сьвяту, адбылося адчыненьне некалькіх прафсаюзных клюбаў, перабасталываных з сынагог.

Дзень 8 лістапада Бабруйск адзначыў закладкай фундаманту вялікага трохпавярховага дому, дому Чырвонай арміі і прачашнай. Гэтыя будынкі будуць скончаны да 12 гадавіны Кастрычніка.

Так Бабруйск адсьвяткаваў 11 гадавіну Кастрычніка і прыступіў да далейшай сваёй буднічнай работы.

А. Дамброўскі.

Упэўнена--наперад.

(Заслаўскі р., Меншчына).

Адзінаццаць год прайшло ў напружанай працы па адбудаваньні гаспадаркі нашае краіны.

Шмат зроблена на гэтым фронце і ў вёсках Старасельскага сельсавету. Не пазнаць цяпер нашых вёсак, а адаецца і часу прайшло мала. Шэрыя, закураныя хаткі, недаступныя да сонечнага сьвятла, заменены сьветлымі, чыстымі дамамі. Хлявы для скаціны таксама заменены чыстымі ды прасторнымі. Зьмяніліся формы апрацоўкі зямлі. Калі да 1920 году ў нас яшчэ ў шырокім маштабе ўжываліся сохі ды драўняныя бароны, дык зараз іх нідзе не пабачыш. Аб'яднаўшыся разам, гаспадары многіх вёсак набылі драпакі, бароны «зіг-заг», плугі і інш. прылады. Большая палова нашых вёсак перайшла на шматпольле (6-ціпольле) і штучнае ўгнаеньне глебы: фасфарытамі, калійнымі солямі. Ураджаі ўзрасьлі прыблізна ў 2 разы ў параўнаньні з мінулым.

Павялічылася і сьвядомасьць нашага насельніцтва. Ні адзін сход не праходзіць без актыўнага ўдзелу сялянства. У сельсавеце 2 каапэратывы, 3 малочныя арцелі, камітэт узаемапамогі ды інш. Ва ўсіх гэтых арганізацыях працуюць сяляне сумленна, ня робячы ніякіх злоўжываньняў. Ёсьць у нас і такія арганізацыі, як ТДА-Авіяхім, МОПР, ДН—і ў іх дзесяткі актыўных земляробаў і на гэтым фронце вядзецца энэргічная праца.

А. Гладкі.

Сымфонія перамог.

(Ліст з Віцебску).

Буйныя ўсходы.

Буйныя, вясёлыя і радасныя:

— Пераможны пралетарыят сьвяткуе дзень свайго вызваленьня.

— Вышэй сьцягі!

Адзінаццаць год пралетарскай рэвалюцыі перадае дванаццатаму шмат нявырашаных задач, але разам з тым перадае буйнейшыя посьпехі, якімі сапраўды можа ганарыцца ўсё чалавецтва.

Гляньце на шматтысячныя шэрагі дэманстрантаў рабочых калён, якія з самага ранку навалай запружылі шырокія віцебскія вуліцы; углядзецеся ў твар кожнага рабочага, кожнага пралетарыя. Аб чым рапартуе сёньня пра жатарскі Віцебск рабочым і селянам Савецкай Беларусі, а разам з тым працоўным усіх Савецкіх республік.

Высока над галовамі дэманстрантаў транспарант —віцебскага фанэрнага заводу. Сымфонія першая:

— Прадукцыйнасьць працы рабочых заводу павялічылася на 250 проц. Замест 320 куба-метраў фанэрны завод сёлета дае 810 кубаметраў; заробак рабочых павялічаны ў два разы, будуем спецыяльныя дамы пад рабочыя кватэры; абсталявалі завод новай паравой машынай, новай дымавой трубой, рамантуем шухаўскі кацёл, ставім другі сушыльны прэс. Усё гэта дае нам магчымасьць у бліжэйшыя месяцы перайсьці на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Перад вачыма паўстае новы транспарант,сымфонія другая—беларускі пуцілавец—завод «Чырвоны Металіст».

У дзень завод вырабляе сорак малаціл, семдзесят вялак, плугоў, конных прыводаў; гартуем сапраўдную рабоча-селянскую змычку. У новы рабочы пасёлак мы раскватэравалі 20 рабочых сямействаў. Сёньня адчыняем новы будынак на 8 кватэр.

На руінах старога будуем новыя, сьветлыя дні.

Сымфонія нумар тры.

Рабочы выходзіць з сутарэньняў, баракаў і канур у камфартабельныя добра абсталяваныя будынкі. Пасёлак тэкстыльнай ф-кі „Дзьвіна" дае рабочым 52 абсталяваныя кватэры Харчавікі, лесапільшчыкі, фанэршчыкі, панчошніцы і г. д. таксама больш 80 рабочых сямействаў усяліліся ў новыя памяшканьні.

* * *

Пралетарскі горад дапамагае вёсцы. Ідзе сьвятошная пераклічка паміж гарадамі, вёскамі, мястэчкамі і сёламі вольнай працоўнай Беларусі.

Рапартуе Езарыцкінскі райён, які мае ў сябе Руднянскі сельсавет, які за добрую пастаноўку працы атрымаў ад Усесаюзнага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ў падарунак моцны радыёпрыёмнік, высокія мачты якога сваімі верхавінамі ўтыкаюцца ў самае неба.

Рабочыя сувязі злучаюць горад з вёскай. Яны сёньня ганарацца сваімі дасягненьнямі. 52 паштовыя пункты, 200 лістаносцаў штодзень злучаюць далёкія куткі акругі з культурай, асьветай. Самая далёкая вёска мае магчымасьць атрымаць газэту, чытаць кнігу.

М.

Рыхтуемся да палепшаньня ваенізацыі ў зімовы час.

Нядаўна Рагачоўскі райсавет ТДА-Авіяхіму сумесна з сэкратарамі ячэек ТДА праводзіў нараду аб пераходзе гэтай арганізацыі на зімовы плян працы.

У выніку абмену думак па інфармацыі старшыні райсавету нарадай былі прыняты пастановы аб палепшаньні некаторых галін працы нашага ТДА-Авіяхіму.

Справаздачы гарадзкіх і вясковых ячэек, напр., не наладжаны. Зьвесткі ячэйкамі ў райсавет падаюцца кепска. Вучот працы і складу ячэек не дасканалы; маецца некаторая запазычанасьць сяброўскіх узносаў.

Ячэйкам запрапанавана праводзіць сваю працу і працу гурткоў па плянах адзін раз у два тыдні, прыцягнуўшы да гэтай справы дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і малодшы начсклад, завесьці вучот па формах кніг, якія маюцца ў райсавеце ТДА.

Гвакамісіям даручана праверыць запазычанасьць і прыняць меры да своечасовага ўзысканьня сяброўскіх узносаў.

Пры райсавеце намечана арганізаваць санітарную каманду, якая-б дапамагла ажыўленьню працы ТДА-Авіяхіму.

Трэба спадзявацца, што нарада дасьць добры штуршок да ажыўленьня працы ў ячэйках зімою.

Я. Крушына.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Здача закантрактаванага лёну-насеньня праходзіць пасьпяхова.

Магілеў, 12-XI. Здача ільнасемені па кантрактацыі праходзіць з посьпехам. Па няпоўных зьвестках, за кастрычнік месяц паступіла 342 тоны, што складае каля 120 процантаў месячнага пляну і 60 процантаў агульнае колькасьці, падлягаючае здачы.

Слаба са здачаю ячменю, што частова тлумачыцца позьняю яго ўборкаю ў сёлетнім годзе. За кастрычнік выпаўнена 31 проц. месячнага заданьня.

Што датычыцца бульбы, дык, па зьвестках крэдытных таварыстваў, здача складае ўсяго 157 тон альбо 4 з палов. проц. месячнага пляну. Фактычна, зразумела, дадзена больш, бо бульба здаецца сялянамі на бровары, і пасьля здачы селянін не сьпяшаецца зарэгістраваць яе ў сваім таварыстве.

Для ўзмацненьня здачы па кантрактацыі акрсельсаюз вылучыў для працы на мясцох трох таварышоў.

Упарадкуем водпуск лесу.

У мінулыя гады пры водпуску насельніцтву лясьніцтвам будаўнічых матар'ялаў і паліва ня было плянавасьці, у выніку чаго насельніцтва каб атрымаць лесарубачны білет і заплаціць грошы за адпушчаную драўніну прыходзіла за 20 і больш кілёмэтраў у Чавусы, дзе знаходзіцца канцэлярыя лясьніцтва. Дзякуючы адсутнасьці плянавасьці, у адзінь дзень прыходзілі сяляне з некалькіх сельсаветаў, у сувязі з чым былі выпадкі, што ў лясьніцтве быў вялікі натоўп сялян, стаяўшых у чарзе па цэлых днях.

У гэтым годзе, каб скараціць дзеньгубства насельніцтвам, распрацаваны плян, згодна якога лясьніцтва будзе выязджаць у кожны сельсавет і на месцы адпускаць драўніну насельніцтву згодна складзеных сельсаветамі сьпісаў.

Водпуск драўніны ў гэтым годзе пачнецца з 15 лістапада,—значна раней чымся ў мінулыя годы.

Чавусы, Магілеўшчына. **Лапіцкі.**

Дэлегаткамі абралі бедняцак.

(В. Танежы, Тураўскага р.).

Да перавыбараў была праведзена падрыхтоўчая кампанія. Было зроблена пасяджэньне групы беднаты, на якім былі абгавораны кандыдатуры ў новы склад дэлегацкага пункту.

У гэтым годзе да перавыбараў дэлегаткі аднесьліся больш сур'ёзьней, чым у мінулым годзе. Лік прысутнічаўшых жанчын на сходзе значна павялічыўся ў параўнаньні з мінулым годам. На сходзе прысутнічалі жанчыны і з грудными дзяцьмі.

На сходзе быўшыя дэлегаткі выявілі, што праца дэлегацкага пункту была слабаватай з тае прычыны, што ў склад дэлегацкага пункту былі абраны маладыя дзяўчаты, якія мала цікавіліся працай і зусім не наведвалі сходы.

Добра абмеркавалі жанчыны новыя кандыдатуры і падыходзілі к перавыбарам сур'ёзна. Многія з жанчын заўважылі, што такая-то ня будзе наведваць сходаў і яе ня трэба ўводзіць, бо яна карысьці ня дасьць.

Такім чынам, цяпер абрана ў склад новага дэлегацкага пункту 45 дэлегатак. Па сацыяльнаму складу—большасьць жонкі беднякоў і рабочых. Па сямейнаму становішчу амаль-што (за выключэньнем пяці) усе замужнія.

З ліку быўшых дэлегатак абрана цяпер 15 дэлегатак. Можна спадзявацца, што праца дэлегацката пункту палепшыцца ў параўнаньні з мінулым годам.

С. Шаўковіч.

Мазыршчына.

УСЕАГУЛЬНАЕ НАВУЧАНЬНЕ.

Полацак, 12-XI. 1-га лістапада г. г. акрвыканком пастанавіў: увесьці ў 73 школьных пунктах усеагульнае навучаньне. Кожны пункт ахоплівае каля 15-20 наўкольных вёсак.

За невыкананьне пастановы вінаватых будуць штрафаваць па 50-100 і больш рублёў. У некаторых мясцох навучаньне ўжо ўведзена.

НА ДАПАМОГУ БЯСПРЫТУЛЬНЫМ.

ДРЫБІН, 12-XI. (Аршаншчына). Пры актыўным удзеле партыйнай і камсамольскай ячэек — па Гаспадоўскаму сельсавету сабрана 35 рублёў у карысьць бяспрытульных.

Цікава адзначыць, што давала ахвяраваньні толькі беднота.

Рыхтуемся да вясеньняга севу.

Магілеў, 12-XI. Зроблена разьвёрстка паміж крэдытных таварыстваў загатовак насеньня (аўсу, вікі, лубіну, сэрадэлі, ячменю сартавога, лёну-даўгунца) для веснавога севу. На загатоўкі ў працягу першага кварталу вызначана 102 тысячы рублёў. Агульная сума мясцовых загатовак насеньня складае 180 тысяч руб. Загатоўкі павінны быць скончаны да 1 красавіка.

Скарачаем адміністрацыйныя выдаткі.

Мазыр. 10-11. АКК РСІ правяла агляд скарачэньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў на лесапільным заводзе «Пралетары». З агляду відаць, што скарачэньне прайшло ўсяго на 16 проц., што большае зьніжэньне немагчыма правесьці з-за пашырэньня вытворчасьці.

У наступным запрапанавана адміністрацыі заводу ўзяць курс на яшчэ большае зьніжэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, давёўшы іх да 20 проц.

Рабочыя патрабуюць зачыненьня піўной.

Акруговая культканфэрэнцыя, дзе прысутнічала шмат рабочых, пастанавіла зачыніць некалькі піўнушак і замест іх адчыніць культурныя чайныя, але гэтая пастанова нібы і ня існуе для адміністрацыйнага аддзелу, які адчыняе яшчэ адну краму з гарэлкаю, таму рабочыя вельмі абураны і патрабуюць зачыніць піўнушку па вул. Жытамірскага.

Мазыр. **Рабочы.**

СУПРОЦЬ АЛКАГОЛЮ.

Ворша, 12-11. Сяляне вёскі Юрцава, Аршанскага райёну, на агульным сходзе вынесьлі пастанову, каб у мясцовым каапэратыве ня было больш ніводнага літру гарэлкі.

ЗАКОНЧАНА АДГРУЗКА ЯБЛЫК.

Магілеў, 12-XI. На экспарт адгружана 58 вагонаў яблык. Для Ленінграду—14 вагонаў, мясцоваму рабочаму каапэратыву—2 вагоны і ў Мазыр дзеля пераапрацоўкі—7 вагонаў.

ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ АФОРМЛЕНА У СУМЕ 8.684.000 РУБ.

НАДЗВЫЧАЙНЫ ПОСЬПЕХ ПАЗЫКА МЕЛА Ў ПРАМЫСЛОВЫХ АКРУГАХ.—ВІЦЕБСК ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ НА 205 ПРОЦ., МЕНШЧЫНА—НА 174 ПРОЦ. АПОШНЯЕ МЕСЦА ЗАЙМАЕ АРШАНШЧЫНА ДЗЕ ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА НА 139 ПРОЦ.

(Гутарка з начальнікам валютнага кіраўніцтва НКФ БССР т. Гальперыным).

Водлуг вестак Наркамфіну, па ўсёй БССР да 1 лістапада было аформлена папярэдняй падпіскі на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на 8.684.000 руб. Некаторыя працаўнікі выказалі небясьпеку, што сума аформленай падпіскі будзе ніжэй папярэдняй. Жыцьцё-ж паказала, што гэта небясьпека не апраўдалася.

Трэба думаць, што ня толькі поўнасьцю аформлена папярэдняя падпіска на пазыку, але ў апошнія дні яшчэ павялічылася. Гэтаму дапамагла паўторная тлумачыцельная кампанія, якая была праведзена па некаторых акругах. У апошнія дні былі ўцягнуты ў падпіску на пазыку некаторыя адсталыя групы рабочых і служачых. Такім чынам да 1 лістапада сваё арыентыровачнае заданьне БССР выканала на 167 проц.

Валютны аддзел Наркамфіну яшчэ ня мае вестак аб ходзе рэалізацыі пазыкі па ўсяму Саюзу Савецкіх Рэспублік, але трэба спадзявацца, што БССР захавала першае месца ў галіне выкананьня кантрольных арыентыровачных заданьняў. Гэтае месца БССР заняла ў ходзе папярэдняй падпіскі на 2-ую пазыку індустрыялізацыі.

Выключнае месца ў выкананьні кантрольных лічбаў сярод усіх акруг Беларусі заняла Віцебшчына, якая рэалізавала пазыкі на 205 проц. свайго заданьня. Няма падстаў меркаваць, што Віцебскай акрузе было дадзена заданьне меншае, чым трэба. Наадварот мы, пры разьмеркаваньні кантрольных лічбаў па акругах, падлічылі тую акалічнасьць, што Віцебск у беларускіх умовах зьяўляецца буйным прамысловым цэнтрам і таму Віцебскай акрузе была больш павялічана кантрольная сума ў параўнаньні з іншымі акругамі.

Апрача асаблівасьці структуры прамысловасьці, што значна палягчала правядзеньню калектыўнай падпіскі, мы вялікі посьпех у рэалізацыі пазыкі ў Віцебскай акрузе тлумачым большай чоткасьцю ў працы фінансавых органаў Віцебшчыны, дзе кампанія была праведзена вельмі дасканала.

За Віцебскам чарговыя месцы займаюць Меншчына (174 пр. заданьня), Бабруйшчына (167 проц.) і Гомельшчына (163 проц.).

Хоць іншыя акругі і ня маюць такіх высокіх процантаў выкананьня заданьняў, як Віцебшчына, Меншчына, Бабруйшчына і Гомельшчына, але ўсё-ж няма ніводнай акругі ў БССР якая-б ня выканала сваіх кантрольных лічбаў з перавышэньнем. Так, нават Аршанская округа, якая ў гэту кампанію заняла апошняе месца, таксама выканала сваё заданьне па рэалізацыі пазыкі на 139 проц.

Кампанія па рэалізацыі пазыкі яшчэ ня скончана: у горадзе апошні дзень афармленьня быў 10 лістапада, апрача таго, рэалізацыя на вёсцы, для часовых рабочых, на транспарце і для вайсковых часьцей працягнецца да 1 сьнежня. Вось чаму магчымы некаторыя зьмены ў суадносінах выкананьня заданьняў паміж асобнымі акругамі.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР.

Сьвяткаваньне дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР павінна прайсьці пад лёзунгам высьвятленьня ўсіх нашых дасягненьняў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

12-га лістапада пад старшынствам тав. Хацкевіча, Цэнтральная Камісія ЦВК БССР разглядала цэлы шэраг пытаньняў па падрыхтоўцы сьвяткаваньня агалашэньня дзесяцігодзьдзя БССР.

ПЛЯН СЬВЯТКАВАНЬНЯ Ў МЕНСКАЙ АКРУЗЕ.

Намесьнік старшыні Менскага АВК тав. Рабіновіч зрабіў даклад аб ходзе падрыхтоўкі да сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР у Менскай акрузе. Сьвяткаваньне распачнецца ў апошні дзень, у працягу якога будуць арганізаваны ўрачыстыя пасяджэньні сельскіх і местачковых саветаў і РВК з удзелам партыйных, камсамольскіх, прафэсіянальных, грамадзкіх арганізацый і сялянства. На гэтым пасяджэньні будуць выступленьні з дакладамі і ўспамінамі аб утварэньні і барацьбе за БССР і аб дасягненьнях за 10 год яе існаваньня. У кожным больш-менш буйным вясковым асяродку намечана правесьці даклады, прысьвечаныя гэтаму пытаньню.

У гарадох Менску і Барысаве падрыхтоўка да сьвяткаваньня распачнецца 23-га сьнежня, шляхам арганізацыі сходаў і вечароў з дакладамі на адведзеныя тэмы: гэта пытаньне павінна быць узгоднена з прафэсіянальнымі арганізацыямі. У гор. Барысаве будзе склікана ўрачыстае пасяджэньне пленуму Барысаўскага гарсавету, з удзелам савецкіх, партыйных, прафэсіянальных, грамадзкіх арганізацый і сялянства. У Менску ў сувязі з скліканьнем сэсіі ЦВК БССР,—асобнае ўрачыстае пасяджэньне пленуму Менгарсавету не прадбачыцца, а члены гарсавету прымуць удзел ва ўрачыстым пасяджэньні сэсіі ЦВК БССР.

У Менску ў дзень адчыненьня сэсіі ЦВК БССР будуць арганізаваны дэманстрацыі, а першага отудзеня адбудзецца парад Чырвонае арміі Менскага гарнізону.

Менскі АВК рыхтуе выдаць ад імя АК КП(б)Б, АВК, ЦСПСБ адозву-лістоўку на 4-х мовах, выдаць кніжку „Менск за 10 год у нацыянальным, культурным і гаспадарчым будаўніцтве", сэрыю паштовак, якія будуць характарызаваць гісторыю рэвалюцыйнага мінулага і оучаснага сацыялістычнага будаўніцтва ў гор. Менску.

У галіне адзначэньня гэтага юбілею АВК прымае цэлы шэраг захадаў. Раённыя выканаўчыя камітэты рыхтуюць арганізацыю шэрагу калгасаў да дню сьвята. Апроч гэтага, надаецца імя 10-цігодзьдзю агалашэньня БССР 7-мігадовай школе ў Менску, пабудаванай на Ляхаўцы, Шацкай больніцы, Капыльскаму камбінату, Цэнтральнаму Дому Селяніна ў Менску.

Дзеля ілюмінацыі і ўпрыгожаньня гораду будуць прыцягнуты да працы цэнтральныя мастацкія аб'яднаньні.

ШТО ЗРАБІЛА ВІЦЕБШЧЫНА Ў СПРАВЕ ПАДРЫХТОЎКІ.

Прадстаўнік Віцебскай акругі тав. Варанецкі зрабіў даклад аб тым, што робіць Віцебшчына ў справе падрыхтоўкі да сьвяткаваньня агалашэньня БССР. З гэтага дакладу вынікае, што ў Віцебскай акрузе падрыхтоўка да сьвяткаваньня ўжо пачалася, але яшчэ пакуль што мала разгорнута.

Па дакладу тав. Варанецкага Цэнтральная Камісія прызнала, што праца падрыхтоўкі да сьвяткаваньня ў Віцебскай акрузе толькі распачалася. Камісія пастанавіла больш плянава распачаць падрыхтоўку да сьвяткаваньня, упягнуўшы ў гэту справу шырокія колы рабочых і сялян. Дзеля большага асьвятленьня гістарычна-рэвалюцыйнага моманту агалашэньня БССР у кампаніі падрыхтоўкі трэба прыцягнуць краязнаўчыя арганізацыі пісьменьнікаў і мастацкі тэхнікум.

УДЗЕЛ ЖАНЧЫН У СЬВЯТКАВАНЬНІ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ БССР.

Тав. Крамер зрабіла даклад аб удзеле жанчын у сьвяткаваньні агалашэньня БССР. Дакладчыца падкрэсьліла, што жанчыны як у горадзе, так і ў вёсцы павінны адзначыць гэта сьвята ў сямейным быту, трэба, каб усе сям'і адчувалі гэты ўрачысты момант. З 1 да 15 сьнежня будзе праводзіцца праца па адзначэньню дзесяцігодзьдзя існаваньня жанарганізацый. Гэта кампанія будзе выкарыстана і для падрыхтоўкі сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя БССР.

Для адзначэньня сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя БССР маюць быць арганізаваны: 10 ясьляў у камунах, 5 дзіцячых садоў у калгасах і 5 кансультацый на вёсках.

Больш увагі с.-г. крэдыту з боку мясцовых органаў.

Гаворачы аб дапамозе с.-г. крэдытам у садзейнічаньні разьвіцьцю нашай сельскай гаспадарцы, нельга не сказаць спачатку некалькі слоў наогул аб дасягненьнях народнае гаспадаркі, дасягненьнях у прамысловасьці, што мае грунтоўную, непарыўную сувязь з крэдытам і, зразумела, з сельскай гаспадаркай, бо ўздым і разьвіцьцё сельскай гаспадаркі залежыць ад прамысловасьці, залежыць ад буйнай індустрыі. Чым больш наша прамысловасьць будзе ўзбуйняцца, шпарчэй разьвіваецца, тым хутчэй будзе разьвіваецца і перабудоўваецца новы, больш інтэнсыўны сацыялістычны шлях і сельская гаспадарка.

Мы ставім сваёй задачай дагнаць і перагнаць узровень не даваеннай Расеі, а перадавых краін сучаснага капіталізму. І калі мы нашы дасягненьні за час рэвалюцыі ў лічбах параўнаем з 1913 годам, то мы бачым вялізарную перамогу, якую мы атрымалі на фронце нашай эканомікі. Па ўсяму Савецкаму Саюзу, у параўнаньні з 1913 г., мы маем вельмі значны рост, асабліва за апошні год—гэта энэргетычнае базы і будаўніцтва машын. 1927-28 г. дае 125 проц. росту каменнага вугалю, 126 проц. нафты, 446 проц. торфаздабываньня, 264 проц. вытворчасьці электрычнай энэргіі, 201 проц. вытворчасьці с.-г. машын і г. д.

Затым мы маем таксама значнае дасягнене ў сыравінных культурах. Уся пасеўная плошча пад тэхнічнымі культурамі ў 1927-28 г. займала 134 проц. у адносінах да 1913 г. Аднак, ураджайнасьць тэхнічных культур у валавай прадукцыі яшчэ не дасягае даваеннай. Прыблізна і ў нас, на Беларусі, якая ўваходзіць у Савецкі Саюз, як частка Саюзу, як частка народнай гаспадаркі, таксама ёсьць значныя дасягненьні ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы. Але ня гледзячы на ўсё гэта і нягледзячы на тое, што ў нас, у Беларусі, пасеўны клін наогул павялічыўся больш, як на 8 проц., нам неабходна прыняць рашучыя меры да ўзьняцьця ўраджайнасьці шляхам калектывізацыі, каапэраваньня і перапрацоўкі сельска-гаспадарчай сыравіны пра пабудову новых прадпрыёмстваў. Інакш кажучы, праз індустрыялізацыю ў сельскай гаспадарцы. І вось тут сельска-гаспадарчы крэдыт павінен мець вялікі ўплыў, вялікую дапамогу сельскай гаспадарцы ў падняцьці ўраджайнасьці і яе разьвіцьці.

Перад намі зараз стаіць задача забясьпечыць поўнасьцю крэдытам разьвіцьцё сел.-гасп. вытворчасьці, як галоўных мерапрыёмстваў інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, якія павінны ўзьняць ўраджайнасьць і даць эфэкт у нашым с.-г. жыцьці. Гэтыя мерапрыёмствы наступныя: 1) зямляўпарадкаваньне, мэліярацыя і мэханізацыя с.-г. вытворчасьці; 2) найбольш шпаркі тэмп у абагуленьні с.-г вытворчасьці праз арганізацыю калектыўных гаспадарак і розных іншых с.-г. вытворчых аб'яднаньняў; 3) максымальнае падвышэньне ўраджайнасьці глебы і падвышэньне якасьці жывёлагадоўлі; 4) узмацненьне перапрацоўкі с.-г. прадуктаў праз пабудову індустрыяльных прадпрыёмстваў і 5) пашырэньне с.-г. экспарту і ўтварэньне больш моцнай сыравіннай базы для прамысловасьці.

На гэтыя мерапрыёмствы, у дадатак да ўкладзеных ужо ў сельскую гаспадарку за мінулыя гады 32 міл. руб., мы маем с.-г. крэдыту 26 міл. 780 тыс. руб., якраз у два разы больш, чым у мінулым гаспадарчым годзе. З гэтай сумы 21225 тыс. руб. даецца з агульных сродкаў сыстэмы с.-г. крэдыту і 5500 тыс. руб. дае наш беларускі ўрад, які вылучае гэтыя сродкі з рэспубліканскага бюджэту. Прычым, доўгатэрміновых крэдытаў укладаецца ў сельскую гаспадарку 19200 тыс. руб., ці 63,7 проц. сродкаў па нашаму пляну.

Такім чынам, мы маем поўную магчымасьць забясьпечыць крэдытам намечаныя мерапрыёмствы, згодна плянавых разьмеркаваньняў, забясьпечыць абагулены сэктар і значна дапамагчы беднаце. У асобным парадку мы ставім пытаньне перад цэнтральнымі органамі аб дапамозе местачковай яўрэйскай беднаце на зямляўпарадкаваньне і іншае гаспадарчае ўпарадкаваньне і вызначаем па сыстэме с.-г. крэдыту 1500 тыс. руб. у дадатак да тых сродкаў, якія ўжо ўключаны ў крэдытны плян. Усё гэта гаворыць аб тым, што ў бягучым годзе на грунце агульнага росту эканомікі краіны мы маем магчымасьць укласьці ў нашу сельскую гаспадарку вельмі вялікія крэдытныя сродкі, асабліва ў абагулены сэктар, а таксама дапамагчы індывідуальным сялянскім гаспадаркам, выключыўшы, як правіла, з сыстэмы крэдытаваньня кулацкія, больш заможныя гаспадаркі. Але ўсё залежыць ад таго, як мы зможам скарыстаць гэты крэдыт, які зьяўляецца асноўным рычагом рэгуляваньня і разьвіцьця сельскай гаспадаркі і зразумела, што ад уменьня скарыстаць крэдыт, ад уменьня правесьці правільна палітычную клясавую лінію залежыць дапамога вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы і выяўленьне эфэктыўнасьці за кошт гэтых вялікіх укладаньняў.

Папершае, неабходна рашуча зьвярнуць увагу на тое, каб ні ў якім разе не дапушчаць затрымкі ў прасоўваньні крэдыту да пазычальніка. Падругое, ні ў якім выпадку нельга распыляць сродкі на выдачу грошай не па прызначэньню, як гэта было ў Полацкай акрузе, дзе акрсельбанкам выдана да 116 тыс. руб. на патрэбы не с.-г. парадку. Патрэцяе, не драбіць крэдыты, а выдаваць іх з такім разьлікам, каб гэты крэдыт мог даць больш карысьці, больш вытворчасьці як у абагуленай сельскай гаспадарцы, так і ў паасобных бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарках. Трэба рашуча разгарнуць практыку комплекснага крэдытаваньня. Асабліва трэба мець гаспадарчыя вытворчыя пляны савгасаў і калгасаў, каб тыя вялікія сродкі, якія мы ўкладаем, сапраўды былі скарыстаны на вытворчасьць гаспадаркі, на падвышэньне ўраджайнасьці, на падвышэньне тавернасьці ў савгасах і калгасах.

Таксама трэба больш рашуча дапамагчы бядняцкім гаспадаркам. Напрыклад, калі выдаецца крэдыт на каня, то калі патрэбна, неабходна адначасова выдаць крэдыт на хлеў, воз, каб дадзеная дапамога крэдытам адчувалася ў гаспадарцы, каб яна дала карысьць і ўзмацніла гэту гаспадарку, зрабіўшы яе больш інтэнсыўнай. Пачацьвертае, —недапусьцімая рэч, калі па некаторых акругах ёсьць паслабленьне інспэктарскага апарату, паслабленьне ў кіраваньні крэдытнымі таварыствамі з боку акруговых таварыстваў сельска-гаспадарчага крэдыту. Такія адносіны да нізоўкі зьяўляюцца невыкананьнем пастановы 15-га Зьезду партыі ў галіне каапэраваньня сельскай гаспадаркі, узмацненьня сыстэмы сел.-гаспадарчага крэдыту і невыкананьнем дырэктыў па прыцягненьню і ўкладаньню сродкаў сялянства ў лагво сельска-гаспадарчага крэдыту. Адсюль такія вынікі: 1) несвасчасовае скарыстаньне фондаў па каапэраваньню беднаты; 2) няправільнае скарыстаньне фондаў на крэдытаваньне беднаты; 3) крэдытаваньне ў некаторых выпадках кулацкіх, больш заможных гаспадарак; 4) адсутнасьць у некаторых крэдытных таварыствах пляну з сацыяльна-эканамічнай устаноўкай крэдытаваньня; 5) невыкананьне дырэктыў па праверцы скарыстаньня сродкаў і выяўленьня эфэктыўнасьці за кошт укладаньня сродкаў у сельскую гаспадарку; 6) затрымліваньне крэдытных (пазычальных) сродкаў у таваразвароце.

Трэба зрабіць рашучы пералом у працы крэдытных таварыстваў (нізоўкі) ад казённага разьмеркаваньня сродкаў да гаспадарчага скарыстоўваньня крэдытаў з мэтай вытворчых дасягненьняў у сельскай гаспадарцы.

Неабходна больш зьвярнуць увагі з боку мясцовых партыйных і савецкіх органаў і дапамагчы крэдытным таварыствам у выпаўненьні пастаўленых перад імі задач.

Такім чынам, сельска-гаспадарчы крэдыт зьяўляецца крэдытам вытворчым, і мы павінны скарыстоўваць яго выключна на вытворчыя мэты з пункту погляду падняцьця вытворчасьці, падняцьця ўраджайнасьці, забясьпечаньня сел.-гасп. сыравінай прамысловасьці, забясьпечаньня хлебам рабочае клясы, Чырвонай арміі і працоўнага гарадзкога насельніцтва і павялічэньня нашага экспарту. Так і толькі так трэба падыходзіць пры разьмеркаваньні і крэдытаваньні сельскай гаспадаркі. А таму, калі мы даём крэдыт, то павінны ведаць, на што даём крэдыт і каму, а выдаўшы, прасачыць і праверыць, як скарыстоўваецца крэдыт, яго карысьць у гаспадарцы, вынікі вытворчасьці і г. д. Трэба прыцягнуць да гэтай справы і аграномаў і сельсаветы. Трэба больш раскачаць работу сярод каапэрацыйнага актыву, сярод груп беднаты шляхам плянавых дакладаў крэдытнымі таварыствамі на сходах беднаты, пленумах сельсаветаў і г. д. Трэба прыдаць больш грамадзкасьці нашай крэдытнай палітыцы на вёсцы. Тады ня будзе выпадкаў крэдытаваньня кулакоў, скажэньня клясавай лініі, распыленьня крэдытаў, сабезаўшчыны, а будзе правільнае скарыстаньне міліённых сродкаў, укладаемых у сельскую гаспадарку, што, бязумоўна, будзе садзейнічаць узьдыму ўраджайнасьці і больш шпаркаму разьвіцьцю сельскае гаспадаркі па таму шляху, які ўказвае нам XV зьезд партыі.

А. Дубіна.

Загатоўкі на Мазыршчыне.

(Ад нашага карэспандэнта)

Мазырская округа—спажываючая, а ня вытворчая. З гэтае прычыны хлебазагатоўкі яе маюць вялікага значэньня ў гаспадарчым жыцьці акругі. Куды больш важнае месца займаюць загатоўкі экспартнае сыравіны—пушнін, шчаціны, грыбоў, чарнікаў, шпігінару і г. д. Вось чаму плян хлебазагатовак у Мазыршчыне быў устаноўлен усяго толькі ў 90.000 пуд. таварнага хлеба (разам з калгасамі).

Апрача гэтага, заданьне па збору натуральнае памольнае платы вызначана мінімальна ў 140.000 пуд. Значна больш вялікім зьяўляецца плян загатовак экспартнае сыравіны. Апрача загатоўкі асноўных відаў гэтае сіравіны вялікая ўвага зьвяртаецца пытаньню разьвіцьця другарадных відаў экспарту.

Сюды належаць такія рэчы як цяляччы тры бухі кішкі воск, рыжае, рогі, капыты, косьці. Раней на гэтыя віды сыравіны не зварочвалася амаль ніякае ўвагі ў той час, як экспарт гэтых прадуктаў хавае ў сабе вялікія магчымасьці. Трэба адзначыць адсутнасьць загатовак ракаў, журавіны і інш. У дарэвалюцыйны час журавіна грала вельмі значную ролю ў эканоміцы Палесься. Чамусьці цяпер аб журавінах нічога ня чуваць.

У апошні час, па ініцыятыве таварыства праязнаўства ўзьнята пытаньне аб мэтазгодасьці выкарыстаньня багацейшых запасаў вадзянога араха.

Як жа праходзяць загатоўк

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Удзел школы ў перавыбарах саветаў.

Перавыбары саветаў зьяўляюцца надзвычайна важным момантам у нашым жыцьці.

У залежнасьці ад таго, як працоўныя масы адносяцца да выбараў улады рабочых і сялян, каго яны туды пашлюць, будзе залежаць і тэмп нашага савецкага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Наша савецкая школа не павінна застацца ў баку ад удзелу ў перавыбарах саветаў. Яна павінна загадзя рыхтавацца да перавыбараў: дагаварыцца з ячэйкай КПБ, ЛКСМ і грамадзкімі арганізацыямі аб адзіным напрамку працы, аб увязцы правядзеньня падрыхтоўчае працы і г. д.

Школа праз вучняў павінна зьвязацца з іх бацькамі, растлумачыць ім ва спецыяльных сходах у школе і праз вучняў сутнасьць і характар савецкае ўлады, яе задачы і практычныя дасягненьні з часоў Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Працу мясцовых саветаў школы павінны вывяць у дыяграмах, табліцах і лічбах. Такія матар'ялы школа павінна падрыхтаваць своечасова.

Антысавецкія элемэнты (кулакі, ксяндзы, папы і інш.) за апошні час заварушыліся і вылазяць актыўнасьць. Яны, бязумоўна, пастараюцца правесьці сваіх стаўленікаў у саветы. У процівагу наступу кулакоў неабходна з'арганізаваць бядняцкія і сераднякцкія масы, якія павінны рашуча змагацца з выступленьнямі антысавецкіх элемэнтаў. І тут месца школы не апошняе. Яна павінна давесьці насельніцтву, куды цягне яго кулак і куды павядзе рабочы ці батрак.

Неабходна, каб на сходах як найпаўней былі прадстаўлены бядняцкія і сераднякцкія масы. Школа ў гэтым напрамку можа шмат зрабіць. В. С.

Сямігодка ідзе да канчатковага разбурэньня.

На старонках газэты «Сав. Бел.» ужо быў зьмешчаны артыкул адносна ў сямігодкі г. Амсьціслаўлю, якую разбурылі па прапанове акруговага інсп. асьветы, як кажуць людзі. Але на артыкул ніхто, як відаць, увагі не зьвярнуў, бо тое, што робіцца і ў сучасны момант, яшчэ далей паглыбляе распад школы. Два настаўнікі пакінулі школу, адзін з іх, выкладчык мовы, вельмі добры, школа больш двух тыдняў заставалася бяз выкладчыкаў. Вучні псуюцца, а пад бокам РВК, інспэктар. Потым неяк наладзілася, часова прызначылі загадчыка, далі з іншых школ выкладчыкаў, але потым зноў папаўзьлі назад.

Прадметы амаль што ўсе падзелены на кавалкі, частка другому і трэцяму. На тры групы старэйшага канцэнтру адзін штатны выкладчык, а то ўсе працуюць дзеля нагрузкі.

Цяпер прыдумалі спосаб наладзіць справу. Быў у мясцкоме працасьветы старшыня т. Шалабада.

За «карысную» працу, за тое, што вельмі добра «абараняў» інтарэсы асьветнікаў (даваў згоду на перакідкі і прызначаў жонак знаёмых і сваю на іх месца), з мясцкому яго выдалілі. Куды-ж дзявацца з ім?

Накіраваць яго на пасаду загадчыка ў сямігодкі, даць яму больш адказную пасаду за яго здольнасьці, за тое, што ён «аўтарытэтны» сярод настаўніцтва. Так Амсьціслаўскі РВК хоча ўзнагародзіць Шалабаду.

У той-жа час Амсьціслаўль мае шмат настаўнікаў з вышэйшай асьветай, сярод іх ёсьць партыйцы. Няўжо ў сямігодка зьяўляецца тым непатрэбным месцам, куды зьліваюць усякі бруд? Чалавока, які нашкодзіў на саюзнай лініі, не пакіроўваць загадчыкам сямігодкі, а даць яму запраўды па заслугах, каб другім ня было павадна тварыць непатрэбнае.

Акруговы інспэктарыят асьветы, даўшы згоду разбурыць школу, застаецца з боку. Яго ня цікавіць тое, што вучні закінуты, што з выкладаньнем прадметаў робіцца так, як нельга знайсьці на абшарах Беларусі. А школу наведвае шмат выхаванцаў дзіцячага гарадка, на якіх такія непарадкі адбіваюцца з самага кепскага боку, бо яны шмат прапускаюць лекцый, спозьніваюцца дзякуючы такому развалу.

Пара каму належыць зьвярнуць сваю ўвагу на гэту справу і прымусіць паставіць сямігодку на ногі.

Мясцовы.

Настаўнік Шыдлоўскі засуджан няправільна.

САЮЗ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ ПАВІНЕН НЕАДКЛАДНА ЗАСТУПІЦЦА ЗА ПАКРЫЎДЖАНАГА ГРАМАДЗКАГА ПРАЦАЎНІКА ШЫДЛОЎСКАГА.

(Вёска Вяркалы, Грэскага райёну, Меншчына).

У нумары 10 дадатку да газэты «Савецкая Беларусь», «Працаўнік Асьветы» ад 30 верасьня г. г. была надрукавана нататка «У абарону настаўніка-актывіста», у якой гаварылася аб ганебных учынках былы. старшыні сельсавету Катлінскага суворць загадчыка Вяркальскае школы, Грэскага райёну Шыдлоўскага.

Цалкам згаджаючыся са зьместам памянёнае нататкі, я павінен сказаць, што ў сваіх наглых, бессаромлівых і хлусьлівых учынках у адносінах да Шыдлоўскага Катлінскі са сваімі прыхільнікамі нарыстаўся ўвесь час дапамогаю свайго швагра, гр-на вёскі Вяркалы Сысова Антося.

Калі ў 1926 годзе Шыдлоўскі, як загадчык былога Шацкага райкультаддзелу, не згадзіўся з кандыдатурай гр-на Катлінскага, які хацеў, ня маючы належнай адукацыі, убіцца настаўнікам у Вяркальскую школу, дык апошні тады-ж паабяцаў выдарыць Шыдлоўскага са школы, калі Шыдлоўскі вернецца назад у Вяркальскую школу,

Дзеля выкананьня свае бруднае мэты Катлінскі разам са сваім швагram Сысовым Антосем, сабраўшы хлусьлівых плётні, што нібыта Шыдлоўскі „катуе" дзяцей у школе, дабіліся таго, што ім паверылі і, не дачакаўшыся вынікаў следзтва, без суду—зьнялі Шыдлоўскага з працы. У сваіх хлусьлівых даносах на Шыдлоўскага Катлінскі і Сысоў дабіліся таго, што ўся 5-цігадовая грамадзная праца Шыдлоўскага пры савецкай уладзе, тая валіная яго праца, якою ня помны настаўнік зможа пахваліцца,—зьведзена да нуля.

Зьнаты з працы Шыдлоўскі; радуюцца яго ворагі Катлінскі і Сысоў, але гэтага Сысову паказалася мала; ён захацеў, каб яго Шыдлоўскі баўся так, як баяцца яго ўсе мышары в. Вяркалы, якія толькі шэптам могуць гаварыць пра Сысовых і то толькі пры зачыненых дзьвярох і вокнах. Калі Шыдлоўскага зьнялі з працы, то яму, Шыдлоўскаму, трэба было ведаць, што хлусьня Сысова мае пад сабою моцны грунт, трэба было Шыдлоўскаму зараз-жа зьбіраць свае манаткі і ўцякаць куды вочы глядзяць, але ўвартасьць падвела: вазьмі ён, Шыдлоўскі, ды скажы адной асобе па сакрэту, што яго, Шыдлоўскага, зьнялі з працы дзякуючы „злодзею" Сысову.

Дачуўшыся аб гэтым, Сысоў узбудзіў суворць Шыдлоўскага крымінальную справу за абразу, у выніку якой народ Грэскага райёну 28 кастрычніка г. г., НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ДОКАЗЫ СЬВЕДАК, ШТО СЫСОЎ САПРАЎДЫ—ЗЛАДЗЕЙ, ПАЗБАВІЎ ШЫДЛОЎСКАГА ВОЛІ НА ТРЫ МЕСЯЦЫ ЎМОЎНА.

Ня гледзячы на тое, што сьведкамі было даказана Нарсуду зладзейства Сысова А., УСЁ-Ж-ТНІ СУД ЗНАЙШОЎ МАГЧЫМЫМ ЗАТКНУЦЬ РОТ ГРАМАДЗКАМУ ПРАЦАЎНІКУ ШЫДЛОЎСКАМУ.

Саюз Працасьветы і Наркамасьветы павінны зьвярнуць найвялікшую ўвагу на зьдзеі над сумленным працаўніком наст. Шыдлоўскім, актыўна выступіць у абарону апошняга і пасадзіць на лаўку падсудных усіх тых, хто на працягу доўгага часу рыхтаваў і рыхтуе зараз наст. Шыдлоўскаму дамавіну.

АХТАР.

На барацьбу з рэлігійным дурманам у школе.

Гэтымі днямі ў Доме Асьветы пры пэдгабінэце адбылося першае пасяджэньне сэкцыі Навукова-Мэтадалёгічнага Камітэту НКА па антырэлігійнаму выхаваньню ў школе.

Дакладчык т. Даўгаполаў спыніўся, галоўным чынам, на задачах, якія ў сучасны момант пастаўлены перад школай у галіне антырэлігійнага выхаваньня. Папершае, сам настаўнік павінен аслабяніцца ад рэлігійнага дурману, бо ў нас часам назіраецца, калі настаўнік ці настаўніца ходзяць у царкву або сынагогу і яшчэ жывуць напоўскімі забабонамі. Неабходна падняць адукацыю настаўніка ў галіне антырэлігійных пытаньняў. Падругое—в пытаньнем антырэлігійнай працы неабходна пачынаць знаёміць дзяцей з першага году навучаньня. Антырэлігійныя пытаньні можна і неабходна прапрацоўваць у комплексах «Ахова здароўя», «Кастрычнікавая рэвалюцыя» «Вясновая праца», „1905 год і гапонаўшчына» і інш.

Настаўнікі вельмі шчыра адгукнуліся на заклік т. Даўгаполава і даклад яго выклікаў ажыўленыя спрэчкі.

Усе згаджаліся з тым, што наша школа яшчэ вельмі мала ўвагі зварочвае на антырэлігійнае выхаваньне і часам нашае настаўніцтва плянцуе ў хвасьце за вучнямі.

Выступаўшыя таварышы адзначалі, што трэба ўсім як адзін узяцца за пашырэньне антырэлігійнай працы ў школе. Адначалі і тое, што ў гэтай працы прыдзецца сустрэцца з цяжкасьцямі, бо на дзяцей вялікі ўплыў робіць сям'я. Вырашана правесьці сярод бацькоў вучняў шэраг дакладаў на тэмы прыродазнаўчага характару.

З выступленьняў высьветлілася, што ў менскіх школах ужо арганізуюцца антырэлігійныя гурткі з вучняў другога канцэнтру, і трэба сказаць—дзеці вельмі ахвотна ідуць у гэтыя гурткі.

АСЬВЕТНІКІ СКАРДЗЯЦЦА, ШТО:

Выплату пэнсіі зацягваюць.

Настаўнік Я. Кіміцін з Барысава піша, што Барысаўскі гарсавет плаціць настаўнікам пэнсію ў апошнюю чаргу, пасьля ўсіх іншых катэгорыяў працаўнікоў гораду. Вінават у гэтым і саюз працасьветы, які згадзіўся ўставіць у кал. даговор пункт аб выплаце пэнсіі настаўнікам у тэрмін з 20-га да 1-га кожнага месяца. Гэта ганьба расьцягнуты тэрмін. Вінавата і само настаўніцтва, якое „ў часе заключэньня кал. умовы ня сьмела начальству перачыць".

Я. Кіміцін прапануе паставіць пытаньне аб перагляздзе кал. умовы і гэтым абаравіць правы настаўнікаў.

Аб школе ніхто не клапоціцца.

У вёсцы Вецьвіца, Глыбочыцкага сельсавету, Чэрвэнскага р., на Гомельшчыне, сёлета адчынілі школу. Прызначылі настаўніка, далі дзесяткі два кніжок для 1-ай і 2-ой групы і ўсё. Ні мэблі, ні падручнікаў, ні падсобнікаў не далі. Лаўкі, хоць і рознае стар'ё, сяк-так сабралі, а з іншымі—бяда. Інспэктар заўсёды адказвае—«чакайце».

У вёсцы 70 няпісьменных узросту ад 15 да 30 год. Яны жадаюць быць пісьменнымі але лікпункту ім не адчынілі. Чырвонага кутка таксама няма. Старшыня мясцовага камітэту не выдае на гэту справу сродкаў з культфонду, бо „на што мы тады будзем гандляваць?"

Новы настаўнік унёс разлад у школу.

Добра і дружна працаваў настаўніцкі калектыў Вальнецкай сямігодкі (на Полаччыне). Але 28 кастрычніка прыехаў у сямігодку новы настаўнік-падфкабец, які паставіў ультыматум, каб яму далі 30 тыднёвых гадзін (вольных-жа гадзін было 22). Новы настаўнік, ма'быць нейкім чынам задаволен, бо школы не пакінуў, але настрой настаўніцкага калектыву паў. Гэта выклікана нейкім «канспэрацыйным» выразаньнем зьмычайнага школьнага пытаньня, бяз удзелу пад. рады.

НАМ АДКАЗВАЮЦЬ.

На допіс «Шмат дзяцей застаецца бяз школы» („Сав. Бел." № 217 за 20 верасьня) інспэктура па Сацыяльнаму Выхаваньня НКА паведамляе, што, як выявілася з дасьледваньня на гэтаму допісу, запраўды шмат дзяцей Дубровенскага раёну застаецца бяз школы, нават без пачатковай, «бо плян усагульнага навучаньня нами яшчэ ня выкананы». Што тычыцца 7-мігодкі ў сяле Тухін, Дубровенскага р., дык яна будзе адчынена толькі ў 1929-30 навуч. годзе. У гэтым годзе на Аршаншчыне ўсе райёны пераважай вялікі наплыў у 7-мігодкі, а прынята ў 7-мігодкі прыблізна 25 пр. з віку жадаючых паступіць.

Інспэктура па Сацыяльнаму Выхаваньню НКА гэтым паведамляе, што па допісах, зьмешчаных у газэце «Савецкая Беларусь» № 208-(2396) за 9 верасьня г. г. пад назвамі „ГЭТКІЯ ПАРАДКІ ПАРА ЗЬНІШЧЫЦЬ" і «ЧАМУ ДАЗВОЛІЛІ ПРАЛЕЗЬЦІ», на пытаньню аб недарэчнасьцях у Санюкаўскай ШСМ, было зроблена дасьледваньне, з якога выявілася наступнае:

1) факты, паказаныя ў допісе «ГЭТКІЯ ПАРАДКІ ПАРА ЗЬНІШЧЫЦЬ», падцьвердзіліся і па гэтаму пытаньню прыняты тэрміновыя меры. Загадчык школы пераведзен, загадчык гаспадаркі зьнят з працы, школа укамплектавана лепшым пэдагагічным складам;

2) факты, паказаныя ў допісе „ЧАМУ ДАЗВОЛІЛІ ПРАЛЕЗЬЦІ", не адпавядаюць сапраўднасьці.

Гурток выкладчыкаў матэматыкі і фізыкі пачаў працаваць.

29 кастрычніка адбыўся сход настаўнікаў матэматыкі і фізыкі. На гэтым сходзе заслухан быў даклад т. Сагаловіча аб формуле Сімпсона. Тэма зацікавіла аўдыторыю і пастаноўлена на наступным сходзе зрабіць далейшае разьвіваньне гэтае тэмы.

На сходзе быў вырашан шэраг пытаньняў арганізацыйнага характару: проблемы перавыбары бюро, абгаворана пытаньне аб часе сходаў і пастаноўлена зьбірацца на пачадзелках раз у два тыдні, быў разгледжан праект плану працы на бягучы вучэбны год наступнага зьместу:

Па матэматыцы.

1) Дасьледваць, як вучні розпага ўзросту ўяўляюць праграмны матар'ял па матэматыцы ў 1-м і 2-м канцэнтрах 7-годкі, у 8 і 9 клясах, на агульна-адукацыйных курсах, рабфаках і ў іншых установах

2) Зрабіць з дасьледваньняў вывады, які матар'ял па матэматыцы трэба распрацоўваць адпаведна ўзросту і разьвіцьцю вучняў.

3) Зрабіць вывады, як трэба распрацоўваць праграмны матар'ял па матэматыцы адпаведна ўзросту і разьвіцьцю вучняў.

З гэтых агульных тэм, як дэталі, могуць быць пастаўлены для распрацоўкі наступныя пытаньні: а) суадносіны элемэнтаў чыстай і прыкладной матэматыкі ў школьным выкладаньні; б) роля і месца інтуіцыі, вопыту і лёгікі ў выкладаньні матэматыкі; в) роля і месца прыкладаў і задач (тэхніка і разважаньне) у выкладаньні матэматыкі; г) вусное вылічэньне; д) задачы на вылічэньне і набудову; е) удзел матэматыкі ў распрацоўцы комплексных тэм.

Па фізыцы.

1) Дасьледваць, як вучні розпага ўзросту і разьвіцьця ў розных навучальных установах уяўляюць праграмны матар'ял па фізыцы, 2) зрабіць вывады з дасьледаў, які праграмны матар'ял і як трэба распрацоўваць адпаведна ўзросту і разьвіцьцю вучняў. З гэтых агульных тэм могуць быць пастаўлены для распрацоўкі наступныя пытаньні: а) элементы тэарэтычнай і прыкладной фізыкі ў школьным выкладаньні; б) пастаноўка дасьледаў па фізыцы па розных разьдзелах праграмы; в) экскурсіі фізыкі ў распрацоўцы комплексных тэм.

Мяркуецца, што пасобныя тэмы і пытаньні будуць распрацоўвацца невялічкімі групамі настаўнікаў, што палегчыць працу і дасьць магчымасьць больш грунтоўна гэтыя пытаньні перапрацоўваць. Па меры распрацоўкі пытаньняў будуць рабіцца адпаведныя даклады на агульных сходах.

Апрача гэтай працы, мясцца на ўвазе заслухань і абгаварыць шэраг дакладаў, якія могуць зрабіць навуковыя прапаўнікі. Адпаведныя перагаворы ўжо вядуцца і ад некаторых навуковых працаўнікоў ужо мясцца прынцыповая згода.

Канчатковы план працы будзе разгледжан і зацьверджан на наступным сходзе.

А. Насабуцкі.

НА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ 1929 Г.—НЕКАТОРЫЯ АКРУГІ НЯ ВЕЛЬМІ ЗАВІХАЮЦЦА З ДАСТАЎКАЙ ПЛЯНАЎ СЯЎБЫ І НІЧОГА НЯ РОБЯЦЬ У СПРАВЕ АРГАНІЗАЦЫІ ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЯ.—НОВАЕ Ў КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Для іх законы ня пісаны.

Вясеньняй сяўбе 1929 г. надаецца вялікае значэньне. Па гэтаму пытаньню ёсьць адпаведныя пастановы Савету Працы і Абароны і савету народных камісараў. Узяты цьвёрды курс з самай восені пляновa распачаць падрыхтоўку да сяўбы, правесьці адпаведную агітацыю за зерноачышчэньне, згрупаваўшы вакол гэтага пытаньня ўвагу нашае грамадкасьці. Усе мерапрыёмствы па падрыхтоўцы да сяўбы ўвязаны з лёзунгам павялічэньня ўраджайнасьці, правязеньня ачысткі насеньня ня менш як на 50 проц. і г. д.

Як успрыймаюць гэту вялікую задачу на месцах? Ці робіцца ўжо штонебудзь у гэтай галіне? Ня гледзячы на абежнік Наркамзему і на цэлы шэраг напамінаньняў, Магілеўская і Полацкая акругі і ці гэтага часу не дасталі ў Нар. Кам. Земляробства сваіх плянаў. Адзначым, колькі раз пісалася і напаміналася аб гэтым акругам: першы раз усім акрэа—11-10-28 г. за № 648, другі раз—23-10-28 г. за № 1142, акруговым РСІ і АВК—29-10-28 г. за № 1005, два разы пасылаліся тэлеграмы, але нічога не памагае. Апошні тэрмін быў вызначаны на 6-га лістапада.

Мы патрабуем прыцягнуць да адказнасьці працаўнікоў вышэй пададзеных акруг, якія злачынна-нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў. Мы павінны дабіцца яснай і бесперабойнай працы ў выкананьні нашых агульнадзяржаўных плянаў. Пакуль што мы ня маем упэўненасьці ў тым, што ўсе дырэктывы Наркамзему адносна падрыхтоўкі да сяўбы, зерноачышчэньня і інш. мерапрыёмствы будуць выконвацца своечасова, а ня цераз месяц-два.

Мерапрыёмствы да пашырэньня пляцу тэхнічных расьлін.

На 1928-29 г. вызначаны цэлы шэраг мерапрыёмстваў для пашырэньня пляну тэхнічных расьлін—лёну і канаплі. Мяркуецца закончыць зямляўпарадкаваньне ў 17-ці прамысловых ільнаводных райёнах. На гэта па пляну вызначана прасіць 200.000 руб.

З іншых мерапрыёмстваў трэба адзначыць больш моцны тэмп семяачышчэньня. Да 1930 г. павінна быць даволі машын і пунктаў, каб можна было ачысьціць насеннае семя на ўсе 100 проц. Значна павінен быць пашыран пляц пад засевамі лёну ў саўгасах і калгасах.

Дзеля пашырэньня ільнаводзтва і канаплявodзтва сёлета мяркуецца ўвесьці ільготы па с.-г. падатку ў райёнах пашырэньня гэтых культур. Таксама мяркуецца сёлета пашырыць кантрактацыю лёну на 50 проц., павялічыўшы пляц з 20 да 30 тысяч гэктараў. Апроч гэтага, будзе праведзена кантрактацыя пасеваў канаплі: 1000 гэкт. на мінэральных угнаеньнях і 1500 гэкт. на асушаных балотах.

У сувязі з пашырэньнем пасеваў лёну і канаплі налета ў БССР будзе завезена значна больш мінэральных угнаеньняў. Таксама робяцца захады да своечасовае загатоўкі насеньня. Семя будзе загатаўляцца ў лепшых ільнаводных райёнах. Усё семя, якое будзе прызнана годным, будзе з восені забраніравана.

Новае ў калгасным будаўніцтве.

У працягу бліжэйшых 5 год у БССР мяркуецца арганізацыя калгасаў па плошчы 500.000 гэктараў. Гэта лічба не зьяўляецца максымальнай ва ўмовах нашага будаўніцтва. Дзеля таго, каб палажыць трывалы грунт калектыўнаму с.-г. будаўніцтву, мае быць выдадзены закон, які прадугледжвае поўнае рэгуляваньне калгаснага будаўніцтва.

Паводле праэкту гэтага закону арганізацыя калектываў падзяляецца на тры пэрыяды. Калектыўную гаспадарку нельга арганізаваць адразу. У першы пэрыяд, г. зн. узімку, перад арганізацыяй трэба правесьці падрыхтоўчую працу сярод бядняцка-сераднякцкіх мас і выканаць усе юрыдычныя фармальнасьці. Другі пэрыяд—у працягу лета павінна быць праведзена бясплатна земляўпарадкаваньне, а ўвосень засеяць жыта. Трэці пэрыяд—з восені пачаць будаўніцтва, набываць машыны, скаціну і г. д.

Апроч гэтага, самы разьмер пляцу калгасаў мае быць павялічаны. Сучасныя калгасы БССР маюць у сярэднім па 73 гэкт. Зараз мяркуецца арганізаваць калектывы ад 120 да 450 гэкт.

„ПРАВАКАТАРЫ" І ПЛАГІЯТ.

На працягу двух вечароў 10 і 11 лістапада г. г. у цэнтральным доме працасьветы калектыў тэатру Галубка ставіў новую п'есу рэжысэра гэтага-ж тэатру Станкевіча—„Праваактары". Тэатр Галубка заваяваў сабе вялікую аудыторыю ня толькі на вёсцы, а і ў горадзе. Кожная пастаноўка мае поўную залю і асабліва прэм'ера. У афішы зазначана, што «Праваактары»—прэм'ера, што аўтарам п'есы зьяўляецца Станкевіч, што пераклад з польскае на беларускую мову зрабіў Бусел, і што п'есу ставіць аўтар. Новая п'еса, новы рэжысэр, новы аўтар—усё гэта выклікае яшчэ большую зацікаўленасьць у тых, хто любіць беларускі тэатр. У нядзелю 11-га публікі было надзвычайна многа. Трэба сказаць, што п'еса цікавая, артысты надзвычайна старанна выконвалі свае ролі; адным словам, уражаньне гледача характарызуе тая авацыя (нават з кошкам кветак) якою ён и ладзіў аўтару-рэжысеру ў канцы спэктаклю. Аўтар Станкевіч, які выконваў ролю палкоўніка дэфензывы, далікатна кланяўся, прыемна пакручваючы доўгі вус і, як далікатны чалавек, ён не хацеў заграбаць усе лаўры сабе. Не, ён падняліся з перакладчыкам, ён і Бусла ўзяў за руку і іншых цягнуў паклаціца публіцы.

Кланяўся т. Бусел, а нам шкода было яго; шкода было і публіку і крыўдна за наш тэатр, і вось чаму.

Перад намі ляжыць п'еса украінскага пісьменьніка М. Ірчана „Підземна Галічина"—драма ў 5 дзеях, выданьне другое (выдавецтва «Західня Україна), Кіеў—1928 г.

Зробім маленькае параўнаньне, возьмем першую дзею з самага пачатку і ўсё папарадку:

У Ірчана: Данило—хто там?
У Станкевіча: Андрэй—хто там?
У Ірчана: (Голас—з-за сцены) Відчинить, малю вас!
У Станкевіча: Галкевіч (за дзьвярыма) Адчыніце, дзьверы, адчыніце...
У Ірчана: Даніла—(хутко адягаецца, підходыть до вікна, зазірае) хто-ж там?
У Станкевіча: Андрэй (сьпешна адзяецца, падходзіць да вакна і выглядае) хто там?
У Ірчана: Голас — Ратуйте, ради бога!
У Станкевіча: Галкевіч (за дзьвярыма) Адчыніце, ратуйце,
У Ірчана: Даніла—(Відчиняє дзьвері. Зараз-же вбігає в хату Адам)
Адам—Замикайте двері... двері... Молю вас, заховайте мене!... За мною женеться поліція.
У Станкевіча: (Андрэй адчыняе дзьверы. Сьпешна ўбягае ў хату Галкевіч).
Галкевіч—запрыце дзьверы... Малю вас, охавайце мяне «прашу»!... за мною бочыць пагоня.

І так ідзе літаратурны пераклад п'есы М. Ірчана нават з усімі кропкамі і клічнікамі.

Вось вам канец першае дзеі:

У Ірчана: Данило—Отаке-то людське життя. Псів пани купують, а людзей стріляють... (глянув на дочку). Як же ти зблідла! Холодно тобі? иди спати, зараз іди...
У Станкевіча: Андрэй — Такое-то людзкое жыцьцё... Сабак паны купаюць (тое было куплюць В. Б.), а людзей страляюць (глянуўшы на Ванду). Як ты пабялела; холадна табе ці што, ідзі зараз спаць, ідзі...
У Ірчана: Оленка (глуха) іду.
У Станкевіча: Ванда (глуха) іду.
У Ірчана: Даніла—і не думай про не. Прийшло і кінець. Ходзім.
У Станкевіча: Андрэй Ня думай аб тым, што отала... Прайшло і канец. Хадзем.

Ну, далей б'е гадзіньнік і заслона.

Мы ня маем магчымасьці займаць месца ў газэце, каб правесьці параўнаньне ўсяе п'есы—для гэтага ня хопіць і газэты, бо п'еса Ірчана мае два друкаваных аркушы; ну, а Станькевічавы «Праваактары» зойміць нават крышку больш, бо ён дабавіў сцэнку ў рэстаране, фактычна даваў ён мала, а пераніёс апошнюю дзею ў рэстаран. Вось у гэтым яго „заслугі", як аўтара і рэжысэра. Праўда, усім дзеючым асобам п'есы М. Ірчана, «Підземна Галичина» ён даў новыя імёны:

У Ірчана: Данило—залізничний робітник.
У Станкевіча: Андрэй Санькоўскі—работнік майстэрні чыгуначнікаў.
У Ірчана: Клим його син.
У Станкевіча: Іван—сын яго.
У Ірчана: Оленка—його дочка.
У Станкевіча Ванда—дачка яго.
У Ірчана: Лесь, Тимко, Перший, Другий—робітники.
У Станкевіча: Грышка, Габрусь, Сымон, Антон—рабочыя.
У Ірчана: Адам Микитюк—Шевчук.
У Станкевіча: Зыгмунт Галкевіч—Браніч.
У Ірчана: Гаповський—Веселовський.
У Станкевіча: Шумэль—Абухоўскі.

Як бачым, усё аўтарства Станкевіча ў тым, што ён зьмяніў прозьвішчы дзеючых асоб. Зладзейства відавочна.

Але ў такіх выпадках часам паўстае пытаньне: хто ў каго ўкраў

У нас ёсьць кніжачка: «матар'ялы, што да абароны аўтарскага права», у якой зьмешчаны надрукаваныя і ненадрукаваныя п'есы Станкевіча (на польскай мове). Там п'есы „Праваактары" мы не знаходзім.

Адначасна мы ведаем т. Ірчана, як вядомага украінскага пісьменьніка. Пісьменьнік М. Ірчан пачаў пісаць в 1914 году. У 1924 годзе ў часе дзесяцігодзьдзя яго творчасьці зьявілася многа артыкулаў аб яго творчасьці, характар якое можна бачыць з наступных радкоў т. В. Атаманюка: «У творчасьці Ірчана кідаецца ў вочы характэрная рыса: з яго твораў дыхае шчырая любоў да прыгнечаных шырокіх працоўных мас і глыбокая чалавечнасьць. Цёплае спатуваньне да кожнага чалавека працы, разуменьне нават маленькіх дэталяў людзкое душы і руплівыя далікатныя адносіны да яе—вось гэта і ёсьць тое, што робіць Ірчанавы творы любімымі сярод шырокіх мас».

У Ірчана ёсьць многа п'ес, пераважна для вясковага тэатру: «Бунтар» Выд. 1922 г. Нью-Ёрк—Львоў—Кіеў: «Двойнацять»,—выд. 1923 г. Віньнічэнка, «Нежданий гість», «Іхні біль» «Родина щіткарів», «Підземна Галічина» і інш. Усе яны ў рабочых клюбах, нардамох, студэнцкіх драматычных гурткох карыстаюцца надзвычайна вялікім посьпехам. Некаторыя з іх перакладзены на нямецкую, чэскую, расейскую і інш. мовы і выйшлі ў некалькіх выданьнях.

Гэта ўсё паказвае, што мы маем справу з сур'ёзным пісьменьнікам. А п'еса „Праваактары" Станкевіча зьявілася ў выніку наяўнага прыкрытага польскаю моваю, крадзяжу.

Пісьменьнік М. Ірчан знаходзіцца ў Канадзе і, мажліва, ня будзе прыцягваць Станкевіча да адказнасьці за парушэньне аўтарскага права, бо пакуль што ня ведае аб гэтым. А ў зборы законаў ураду СССР—№ 246 за 1928 г.—ёсьць даволі сур'ёзныя пункцікі наконт крадзяжу і парушэньня аўтарскага права. Аўтар «Праваактараў» Станкевіч, як член таварыства драматычных пісьменьнікаў, мусіць ведае аб ім.

Такога зьявішча на Беларусі дагэтуль мы не наглядалі. Яно зьявілася з прыездам да нас Станкевіча. Прыехаў і адразу плюнуў у твар усяму калектыву тэатру (ня кажучы пра перакладчыка т. Буслна) і грамадзтву, якое так нявінна вітала яго.

Тут пахне крыху надобным.

Тэатр Галубка павінен першы сказаць сваё слова.

Чакаем!

Васіль Базылёвых.

АД ІНБЕЛКУЛЬТУ—ДА АКАДЭМІІ.

Грунт, на якім пачалося сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне,—праклятая спадчына самаўладзтва. Асноўныя рысы гэтае спадчыны—адсталая тэхніка гаспадаркі, надзвычайная беднасьць сялянства, слабая прамысловасьць, народная прыгнечанасьць, а адсюль цемнота, забітасьць, некультурнасьць працоўных, нацыянальная разрозьненасьць і грызьня—былі ўзмоцнены імпэрыялістычнаю вайною. Апошняя дашчэнту разбурыла гаспадарку краіны, зруйнавала асноўны капітал яе, прывяла ў занепад сялянскія гаспадаркі, а само сялянства—да адзічаньня. Грамадзянская вайна, акупацыя белапалякаў дабілі тое, чаго ня зьнішчыла імпэрыялістычная вайна. Агонь Кастрычнікавай рэвалюцыі спаліў бруд, смурод самаўладзтва, але для зьнішчэньня яго спадчыны патрэбен быў пэкаторы час. Гэтую ролю выконвае пераможнік-пралетарыят.

У магутнай сьвядомасьці свае нявычарпальнае творчае сілы рабочая класа разам з працоўным сялянствам будуе новыя формы гаспадаркі, культуры. У выніку гэтага будаўніцтва зьяўляецца будаваньне вышэйшае навукова-дасьледчае ўстановы БССР — Інбелкульту.

Першыя каменьчыкі ў падмурак ІБК былі заложаны ўтварэньнем у 1921 г. Навукова-Тэрміналёгічнае Камісіі пры НКА. Цяжкія і складаныя задачы паўсталі перад гэтаю камісіяй: атрымаўшы практычныя заданьні—укладаньне навуковых тэрміналёгій і падручнікаў для беларусізацыі школ,—яна в першых дзён працы сустракаецца амаль з поўнай адсутнасьцю папярэдняга дасьледаваньня Беларусі. Гэтую прагаліну камісія павінна была запоўніць сваімі навукова-дасьледчымі працамі. А гэта значыць, што яна павінна была арганізацыйна пашырацца, прыцягваць да працы навуковыя сілы, ахапляць усё большы і большы комплекс аб'ектаў дасьледваньня... Так Тэрміналёгічная Камісія падыходзіць да ІБК — навукова-дасьледчае ўстановы комплекснага характару. Рэарганізацыя камісіі ў ІБК адбылася ў 1922 годзе.

У аснову свае навукова-дасьледчае працы Інбелкульт узяў тое палажэньне, што толькі на даных навукі, на яе вывадах можна пасьпяхова будаваць сацыялістычную грамаду. Асноваю свае працы і яе характарам Інбелкульт рэзка адрозьніваецца ад Акадэміі старога тыпу і зусім не падобен да „Інстытуту Беларускае Культуры і Гаспадаркі"—падарунку польскага фашызму працоўным Заходняй Беларусі... Творчасьць фашызму зусім непатрэбна для працоўных, ёю харчуюцца Паўлюкевічы і іншыя лёкаі фашызму.

Кампартыя і савецкая ўлада ўважліва сочаць за развіцьцём Інбелкульту. Год за годам даецца напрамак гэтаму разьвіцьцю. Па матар'ялах, па дакумантах (пастановы СНК БССР у 1924 г., 1927 г., 1928 г. і інш.) можна прасачыць, як спэцыяльныя актамі афарміляецца тое ў разьвіцьці ІБК, што адпавядае сацыялістычнаму будаўніцтву, як замацоўваецца тая арганізацыйная структура яго, якая стала патрэбнаю, жыцьцёваю. Для пасьпяховага пашырэньня і паглыбленьня працы кожны год павялічваюцца сродкі па каштарысу ІБК.

І з кожным годам Інбелкульт пашырае і паглыбляе сваю працу. Цяжка, нават немагчыма ахапіць працу ІБК, яе разьвіцьцё ў газэтным артыкуле. Для гэтага патрэбна спэцыяльная праца. Можна толькі ўказаць на галоўнейшыя напрамкі разгортваньня працы, на аб'екты дасьледваньня.

Праведзена вялікая праца па вывучэньні беларускае мовы: сабрана некалькі сот тысяч слоў з літаратурных крыніц, з народнае мовы, якія лягуць у грунт навуковага акадэмічнага слоўніка (першы том рэдагуецца ў гэтым годзе); апрацавана і выпушчана ў сьвет 18 назваў навуковых тэрміналёгій, якія ахапляюць галоўнейшыя галіны ведаў; дасьледаваны геаграфічныя межы моўных зьяў (дыялекты) на тэрыторыі БССР; вынікі гэтых дасьледваньняў часткаю апублікаваны; сабраны матар'ялы па гісторыі мовы, ёсьць ужо апублікаваныя вынікі гэтае працы; ёсьць значныя дасягненьні ў галіне вывучэньня законаў беларускай мовы, яе асаблівасьцяў і г. д.

Таксама ў галіне вывучэньня гісторыі Беларусі Інбелкульт дабіўся значных дасягненьняў. Дасьледаваны і сыстематызаваны матар'ялы пасобных пытаньняў гістарычнага разьвіцьця беларускага народу і барацьбы клясаў (1863 г. на Беларусі, гісторыя гарадоў—Магілева, Наваградка і інш., эканоміка старостваў у другой палове 18 ст., панская гаспадарка і стан сялянства за той-жа пэрыяд і шмат іншых пытаньняў). Здабытыя матар'ялы ў часе археолёгічных раскопак (Банцараўшчына, Заслаўль, Койданава, Бердыж, р. Ухлясьць і інш.) даюць каштоўнейшыя даныя для вывучэньня старажытнае гісторыі

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб правядзеньні конкурсу на лепшую сэкцыю гарадзкога савету і лепшы сельскі і местачковы саветы з іх камісіямі.

У выкананьне пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ад 23-га верасьня 1928 г. аб правядзеньні конкурса на лепшую сэкцыю гарадзкога савету і лепшы сельскі і местачковы саветы з іх камісіямі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанаўляе:

1. Правядзеньне конкурса распачаць з 1-га сьнежня 1928 г. і скончыць да 1-га красавіка 1929 году.

2. Лічыць, што асноўнымі задачамі конкурса павінна яўляцца:

а) праверка работы саветаў з пункту гледжаньня ажыцьцяўленьня імі ў сваёй штодзённай практычнай працы клясавай палітычнай лініі савецкай улады;

б) выяўленьне лепшых прыкладаў масавай работы саветаў і распаўсюджаньне гэтых прыкладаў на ўсе саветы Беларусі;

в) максымальнае прыцягненьне прапоўных мас да работы саветаў в мэтай далейшага ажыўленьня іх дзейнасьці;

г) выяўленьне ў работе саветаў бюракратызму і іншых хваравітых зьявішч;

д) узмацненьне ролі саветаў, як органаў дыктатуры пролетарыяту, непасрэдных кіраўнікоў і ініцыятараў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і аб'яднаньня навакол іх (саветаў) актыву з рабочых, батрацтва, беднаты, жанчын-актывістак—дэлегатак, сераднякоў і інш. прапоўных;

е) праверка выкананьня дырэктыў органаў савецкае ўлады аб ажыўленьні дзейнасьці саветаў.

Конкурс павінен ажывіць і ўзьняць якасьць работы саветаў, іх сэкцый і камісій.

3. Для практычнага правядзеньня конкурсу ўтварыць пры Прэзыдыуме ЦВК Цэнтральную Камісію па правядзеньню конкурсу ў складзе прадстаўнікоў ад Прэзыдыума ЦВК, СНК, ЦСПСБ, партарганізацый, ЦК ЛКСМБ, ЦК узаемадапамогі, Чырвонай арміі і Менскага Гарадзкога Савету.

4. Для правядзеньня конкурсу ў паасобных округах утварыць акруговыя камісіі ў складзе прадстаўнікоў ад АВК, пашкамісій, прафбюро, жанаддзелу, ЛКСМ, РСІ, Гарсавету і рэдакцый мясцовых газэт, пад старшынствам старшыні АВК.

5. Пры раённых выканаўчых камітэтаў, гарадзкіх саветах арганізаваць камісіі садзейнічаньня на правядзеньню конкурса, у складзе якіх павінны быць прадстаўлены ў дастатковай колькасьці масавыя грамадзкія арганізацыі.

6. Усклясьці на Цэнтральную Камісію непасрэднае кіраваньне дзейнасьцю мясцовых камісій на правядзеньню конкурса, устанаўленьне парадку правядзеньня конкурса ў паасобных округах, вызначэньне ўмоў і парадку прэміраваньня, дачу паказаньняў камісіям, заслухоўваньне справаздач камісій і высьвятленьне ў друку ходу конкурса.

7. Асьвятленьне ў друку ўсіх пытаньняў, зьвязаных з конкурсам, усклясьці на рэдакцыі газэт: «Савецкая Беларусь», «Рабочы», «Беларуская Вёска», цэнтральныя газэты нацменшасьцей і рэдакцыі акруговых газэт.

8. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы зачвяцьвіць удзел у конкурсе школ, палітасьветных устаноў вёскі, для чаго ў тэрміновым парадку распаслаць па гэтым пытаньні канкретныя паказаньні.

9. Цэнтральнай камісіі па правядзеньню конкурса ў тэрміновым парадку распаслаць канкрэтныя паказаньні аб парадку правядзеньня конкурсу ў округах.

10. Лічыць неабходным прэміраваньне апрача лепшых па работе саветаў сэкцый і камісій лепшых карэспандэнцый аб работе саветаў, камісій і сэкцый.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

3 лістапада 1928 году,
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

о проведении конкурса на лучшую секцию городского совета и лучший сельский и местечковый советы с их комиссиями.

Во исполнение постановления Центрального Исполнительного Комитета БССР от 23 сентября 1928 г. о проведении конкурса на лучшую секцию городского совета и лучший сельский и местечковый советы с их комиссиями, Президиум Центрального Исполнительного Комитета постановляет:

1. Проведение конкурса начать с 1 декабря 1928 г. и окончить до 1-го апреля 1929 года.

2. Считать, что основными задачами конкурса должны являться:

а) проверка работы советов с точки зрения осуществления ими в своей повседневной практической работе классовой политической линии советской власти;

б) выявление лучших примеров массовой работы советов и распространение этих примеров на все советы Белоруссии;

в) максимальное привлечение трудящихся масс к работе советов с целью дальнейшего оживления их деятельности;

г) выявление в работе советов бюрократизма и других болезненных явлений;

д) усиление роли советов, как органов диктатуры пролетариата, непосредственных руководителей и инициаторов хозяйственного и культурного строительства и об'единения вокруг их (советов) актива из рабочих, батрачества, бедноты, женщин-активисток-делегаток, середняков и других трудящихся;

е) проверка выполнения директив органов советской власти об оживлении деятельности советов.

Конкурс должен оживить и поднять качество работы советов, их секций и комиссий.

3. Для практического проведения конкурса организовать при президиуме ЦИК Центральную Комиссию по проведению конкурса в составе представителей от президиума ЦИК, СНК, ЦСПСБ, парторганизаций, ЦК ЛКСМБ, ЦК Взаимопомощи, Красной армии и Минского Городского Совета.

4. Для проведения конкурса в отдельных округах организовать окружные комиссии в составе представителей от ОИК, пашкомиссий, профбюро, Женотделу, ЛКСМ, РКИ, Горсовета и редакций местных газет, под председательством председателя ОИК.

5. При районных исполнительных комитетах, городских советах организовать комиссии содействия по проведению конкурса. в составе которых должны быть представлены в достаточной мере массовые общественные организации.

6. Возложить на Центральную Комиссию непосредственное руководство деятельностью местных комиссий по проведению конкурса, установление порядка проведения конкурса в отдельных округах, определение условий и порядка премирования, дачу указаний комиссиям, заслушивание отчетов комиссий и освещение в печати хода конкурса.

7. Освещение в печати всех вопросов, связанных с конкурсом возложить на редакции газет: «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Беларуская Вёска», центральные газеты нацменшинств и редакции окружных газет.

8. Предложить Народному Комиссариату Просвещения обеспечить участие в конкурсе школ, политпросветительных учреждений деревни, для чего в срочном порядке разработать по этому вопросу конкретные указания.

9. Центральной Комиссии по проведению конкурса в срочном порядке разработать конкретные указания о порядке проведения конкурса в округах.

10. Считать необходимым премирование кроме лучших по работе советов секций и комиссий лучших корреспонденций о работе советов, комиссий и секций.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

3 ноября 1928 г.
г. Минск.

ВАЙСКОВЫ КУТОК.

Трэба паглыбіць працу з газэтай.

Палітвыхаваньню ў Чырвонай арміі надаецца вялікае значэньне, ды гэта і зразумела, бо толькі палітычна сьвядомы баец можа рашуча весьці барацьбу в нашымі клясавымі ворагамі. Калі праводзяцца палітгадзіны, гутаркі, сходы, масавая і клюбная праца,—усё гэта карысна і патрэбна. Нам здаецца, што з пераменьнікамі ў тэрчасьцях трэба асабліва вялікую ўвагу зьвярнуць на працу в газэтай і над газэтай. Пераменьнік, які прывучыўся-б чытаць і належным чынам разьбіраць і разумець газэту, пры зваротце ў вёску змог-бы і насельніцтва сваёй вёскі трымаць у курсе сусьветных палітычных падзей і ў курсе нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва; ён змог-бы прыхаводіць да газэты і некаторых найбольш сьвядомых сялян сваёй вёскі.

З пераменьнікамі трэба наладзіць групавое чытаньне і абгаварэньне прачытанага ў газэце, пасьля заняткаў, на прывалах і г. д. Неабходна, каб чыталі на чарзе ўсе пісьменныя чырвонаармейцы; гэта прыдасьць ахвоты да самастойнага чытаньня і чытаньня перад другімі. С.

Ваенізацыя „на паперы".

(Рагачэўскі пэдтэхнікум).

У мінулым навучальным годзе в другога паўгодзьдзя ўвялі ў наш пэдтэхнікум ваенізацыю. Але гэты прадмет красаваўся толькі ў „раскладзе". Студэнты доўга чакалі настаўніка. Нарэшце прысылалі, які і распачаў працу. Студэнты шчыра ўзяліся вывучаць гэты прадмет, ахвотна слухалі лекцыі і выказвалі да іх вялікую ахвоту. Аднак—гэта шчырасьць нядоўга цягнулася. Настаўнік зьнік, скончыліся лекцыі. Прычына зьнікненьня нам не вядома. Ваенізацыя засталася зноў у раскладзе.

Цяпер ужо скора два месяцы, як мы пачалі займацца, а ваенізацыі ня бачым. Зноў яна толькі ў раскладзе. Што ні год, тэхнікум выпушчае новых барацьбітоў — змагальнікаў на культурны фронт, але з гэтых барацьбітоў шмат хто ня ведае самых асноў ваенізацыі. Як-жа яе можна будзе прапагандаваць у вёсцы? Такому становішчу трэба палажыць рашучы канец.

Л. Сірата.

Добры пачатак.

Палітчасьць Н палка атрымала ад сваіх пераменьнікаў ліст і заяву, у якой яны пішуць: «Мы пераменьнікі 1-й культроты, вёскі Пудзіцкая Слабада, Пухавіцкага райёну імкнемся правесьці ў жыцьцё дадзеннае намі абяцаньне кампалітскладу палка, а таксама і нашаму рабоча-сялянскаму ўраду аб пашырэньні свае вайскова-палітычнае адукацыі. Наша вёска надта цёмная і жыве на адных выдумках. Мы аб'ядналіся разам з камсамольцамі, далучылі да сябе сялянскую моладзь і просім дапамагчы нам арганізаваць ячэйку ТДА-Авіяхіму і чырвоны вайсковы куток. Прасіцелі-пераменьнікі: Рак Пятро, Скачок П., Хонскі П., Басько В., Рак А., Хонскі С. і група камсамолу.

Памочнік камандзіра палка па палітчасьці тав. Дабрагост арабіў распараджэньне начклуба і палкавому ТДА дапамагчы у арганізацыі ячэйкі і кутка, забясьпечыць літаратурай і усім неабходным. Трэба спадзявацца, што ўсе належныя мерапрыёмствы в боку палка будуць зроблены. Няхай пачын пудзіцкіх пераменьнікаў будзе прыкладам для ўсіх іншых пераменьнікаў.

Я. Бароўскі.

Змагаемся з недахопамі.

У с. Тапежы, Тураўскага райёну ў 1926 годзе была арганізавана яч. ТДА-Авіяхіму. Праца апошняй ня была прыкметна да 1928 году. Сёлета яшчэ была арганізавана такая-ж ячэйка пры лясьніцтве, а ў 1926 годзе пры заводзе «Чырвоны Дазор».

Усе гэтыя ячэйкі распылена праводзілі сваю працу і не давалі пажаданых вынікаў.

Вясною г. г. па прапанове райсавету заводзкая ячэйка далучылася да вясковай і цяпер яны супольна праводзяць працу. Гэта палепшыла справу ваенізацыі сярод сяброў ячэйкі.

Да недахопаў у працы ячэйкі можна аднесьці слабае ўцягненьне сялян у справу ваенізацыі. Сярод сяброў яч. слаба праводзіцца культурная праца.

Але трэба адзначыць, што бюро яч. ТДА-Авіяхіму вельмі зацікаўлена ў палепшаньні працы і зьніжчэньні гэтых недахопаў. Ужо на зімовы час складзен плян працы, у якім на культурна-выхаваўчую працу зьвернута найбольш увагі.

С. Ш.

ХРОНІКА.

Камандыраваньне членаў ураду ў Маскву.

Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў камандыраваць т. т. Галадзеда, Мікуліча і Калініна ў Маскву па пытаньнях бюджэту БССР.

XI-я гадавіна Рабоча-Сялянскай Міліцыі.

Учора, 12 лістапада, споўнілася XI-я гадавіна існаваньня Рабоча-Сялянскай Міліцыі. На мясцох гэты дзень быў адзначан правядзеньнем урачыстых сходаў і вечароў, дзе былі падагулены вынікі праробленай працы.

У гэты дзень усе работнікі міліцыі і крымышуку былі вызваланы ад заняткаў.

У Менску сьвяткаваньне 11-й гадавіны Рабоча-Сялянскай Міліцыі адбудзецца ў суботу, 17 лістапада.

У гэты дзень увечары адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне прапаўнікоў міліцыі з удзелам партыйных, прафесыянальных, саведніх і грамадзкіх арганізацый, прысьвечанае 11-гадоваму юбілею.

Учора адміністрацыйнай управай НКУС былі атрыманы прывітальныя тэлеграмы, з поваду 11-гадовага юбілею, ад працаўнікоў міліцыі округаў БССР.

Падрыхтоўка да адчыненьня Дому Пісьменьнікаў у Менску.

Гэмі днямі пры Галоўмастацтве адбылася нарада прадстаўнікоў літаратурных аб'яднаньняў па пытаньню аб адчыненьні Дому Пісьменьнікаў у Менску.

Пад Дом Пісьменьнікаў прызначана быўш. памяшканьне Белкамунбанку, а таксама 2-гі паверх гэтага дому (пакуль што заняты пракуратурай Менскай округі). На нарадзе абрана камісія, у складзе т. т. Бядулі, Дудара і Барашкі, якой даручана правесьці падрыхтоўку да ўрачыстага адчыненьня гэтага Дому Пісьменьнікаў у часе сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР.

ПАДАРОЖЖА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ ПА МАГІЛЕЎШЧЫНЕ.

10-га лістапада з Менску выехала ў Магілеў група пісьменьнікаў літаратурнага аб'яднаньня „Полымя", з мэтай правядзеньня на Магілеўшчыне шэрагу літаратурных вечароў і дыскусій.

У гэтую групу ўвайшлі народны паэта Якуб Колас, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі, Андрэй Александровіч і Алесь Гурло.

13 месц на Ўсесаюзную нараду рабселькораў.

27-га лістапада ў Маскве адчыняецца 4-я Ўсесаюзная нарада рабкораў, селькораў, ваенкораў і юнкораў.

БССР на гэтай нарадзе прадстаўлена 13 месц, якія разьмеркаваны наступным чынам: 4 рабкоры, 3 селькоры, 2 юнкоры, 1 батрак, 1 прадстаўнік ад насьцежгазэт, і саведні служаны і 2 газэтных працаўнікі.

Гэтымі днямі гэтыя месцы будуць разьмяркованы па округах БССР.

Камгас рыхтуецца да будаўнічага сэзону 1929 г.

Праўленьне „Домстрою" абвесьціла конкурс на складаньне праэкту жылога дому на 100—120 кватэр, пабудова якога пачнецца вясною 1929 году на рагу вуліц К. Маркса і Камсамольскай (сад мэдсанпрацаўнікоў). Дом мяркуецца будаваць 6-ціпавярховы.

Усё жыльлёвае будаўніцтва Камгасу (новае) у 1929 годзе мае каштаваць 830.000 руб. Рамонтныя работы—115.000 руб. і іншыя дробныя будаўнічыя работы каля 15.000 руб.

Такім чынам на будаўніцтва ў 1929 годзе Камгас вызначыў каля 1 мілёну рублёў.

Мост закончан.

Спэцыяльная камісія, вызначаная аддзелам камунальнай гаспадарні, пры ўдзеле рэспубліканскага інжынэра агледзела новы мост праз р. Сьвіслач у Менску. Пакуль што камісія дазволіла толькі лёгкавы рух па мосту. Грузавы рух будзе дазволен пасьля выпрабаваньня мосту правозам праз яго цяжкага катка.

Мост будаваўся 3 гады. Кошт пабудовы —звыш 220.000 руб.

Рост саматужных арцеляў.

За апошні 1927-28 год па БССР арганізавана 341 саматужная арцель з лікам сяброў у іх 5705 чал.

З гэтай колькасьці арганізаваны 75 шавецкіх арцеляў, 12 мэталёапрацоўчых, 103 краўецкіх, 14 дрэваапрацоўчых, 32 сталярных арцеляў, 11 трыкатажных і іншых —84 арцелі.

Утварэньне лёна-пяньковага камітэту.

На апошнім пасяджэньні Эканомнарады зацьверджана палажэньне аб лёна-пяньковым камітэце. Камітэт будзе ўтворавы пры Эканомнарадзе ў складзе прадстаўнікоў ВСНГ, Наркамзему, Белсельсаюзу, Наркамгандлю і інш.

Нар. Кам. Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі даручана ўстанавіць штаты камітэту.

Машына-тэхнічныя тавары для БССР.

Праўленьнем Машынасьндыкату ўстаноўлен пьёрды плян забясьпечаньня БССР усімі машына-тэхнічнымі таварамі на бягучы 1928-29 гаспадарчы год.

Усяго выдзелена для рэалізацыі на БССР усіх тавараў на 2.409 тысяч руб., з іх сталі—на 15.000 руб., мэталёінструментаў —на 891.000 руб., арматуры—на 378.000 рублёў, машынаабсталяваньня—на 470.000 руб. і г. д.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя книжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „Як сеяць лугавыя травы на насеньне" М. Баранава. Стар. 32, цана 13 кап.
2. „Крок за крокам" Тарас Гушча (Якуб Колас). Выданьне другое. Стар. 61, цана 35 кап.
3. „Плуг" № 10. Навукова-папулярная часопісь сельскай і лясной гаспадаркі. Выданьне Наркамзему БССР. Стар. 39, цана 20 кап.
4. „Красная Новь" кніга 9. Літаратурна-мастацкі і навукова-публіцыстычны журнал. Стар. 255, цана 1 руб. 75 кап.

Дзяржаўнага Выдавецтва Масква-Ленінград

Што будзе зроблена па каналізацыі да зімы.

Да наступленьня марозаў у Менску будзе закончана кладка сьцен насоснай станцыі. Разам з лоткамі (2 кілём.) пракладкаю каналізацыйных трубаў будзе заложана 14 кілёмэтраў. Да зімы мае быць пракладзена 1.300 пагонных мэтраў галоўнага калектара.

Трамвай на Камароўцы.

Пачалася кладка трамвайных рэек па Барысаўскаму тракту. На Камароўцы асталося ўлажыць толькі 1 кілёмэтар рэек. Сёлета мае быць зроблена пракладка рэек ад Савецкай вул., па Доўгабродзкі да месца пабудовы новага парку. На будаўніцтва трамваю працуе 125 рабочых.

Менскі дзень.

Зараз ідзе к канцу будаўніцтва новага корпусу для фабрыкі падак «Возрождение» ў Менску. Пабудова будзе каштаваць 180000 руб. Зараз на фабрыцы працуе 370 рабочых, а пасьля пераходу ў новы будынак лік рабочых будзе даведзены да 950 чалавек.

— Кіраўніцтва працаналетыпаў вырашыла пашырыць менскую фабрыку мэблі. Пабудова новых фабрычных карпусоў будзе каштаваць да 200.000 р.

— Учора ў памяшканьні Белдзяржтэатру адбылося ўрачыстае адчыненьне 7-гі Усебеларускага зьезду саюзу прадаўнікоў мастацтва. Паміж іншымі пытаньнямі зьезд абгаворыць справаздачу ЦК і ЦП саюзу.

— 10-ты зьезд чыгуначнікаў Менскага вучастку адчыніўся 10-га лістапада ў Менску. На зьезд прыбылі 52 дэлегаты і прадстаўнік ЦК саюзу чыгуначнікаў.

— Нарады кіраўнікоў фізкультурных гурткоў адбудуцца ў хуткім часе па раёнах БССР. Па нарадах будуць абгаворваны пытаньні аб формах і мэтадах зімовай працы па фізкультуры ў вёсцы.

— 6.600 тон аўса выдзеліў Саюзны Нар. Кам. Гандлю для забясьпечаньня БССР на лістапад м-ц.

— ЦСПСБ і ВСФКБ рыхтуюцца да пабудовы трох каткоў у садзе „Прафінтэрн". На гэту мэту будзе адпушчана 3.000 рублёў.

— Адчыніўся пленум ВСФКБ. На пленуме будуць заслуханы даклады ЦСПСБ аб працы на фізкультуры сярод прафсаюзаў і аб арганізацыі ўрачэбнага кантролю над фізкультурнікамі. Апрача гэтага будзе абгаворана пытаньне аб арганізацыі ўсебеларускай вясковай спартакіяды.

Чаму позна атрымліваецца газэта?

У рэдакцыю паступае шмат лістоў ад падпісчыкаў з запытаньнем, чаму некаратна дастаўляецца газэта. Менскія падпісчыкі скардзяцца, што вельмі позна прыносяць газэту—гадзін у 7-9 вечара, або і зусім ня прыносяць, а потым праз дзень-два прыносяць адразу дзьве-тры газэты, як гэта робіцца, напр. на Беларускай вул.

Там, кажуць падпісчыкі, пейкі сумленны разносчык заявіў, што ён кожны дзень ня будзе насіць газэты, а будзе прыносіць акуратна праз дзень.

Таварышы-падпісчыкі з Беларускай вуліцы! Гэта ня толькі ў вас так, а і па ўсяму гораду, але ваш лёс пейкі асабліва прыкры. Вы ўжо ведаеце, што на вашай вуліцы і такія здарэньні былі, што разносчык ледзь-ледзь дайшоў да вашай вуліцы і пакінуў сваю торбу з газэтамі ў шаўца, выпіць, думаючы, што той кіне выцць боты ды прынясе вам газэты. Але ён гэтага не зрабіў, а толькі на другі ці трэці дзень узяў ды прынёс гэту торбу паштоваму начальству, каб яно само вам дастаўляла газэты. Але, як бачыце, і гэта не намагло—усяроўна прыносяць газэты праз дзень-два. Пачакайце крыку, магчыма, што будзем атрымліваць кутка ў тыдзень раз—у нядзелю, бо якраз—дзень адпачынку, і вы зможаце прачытаць адразу ўсе навіны за тыдзень.

Таварышы менскія падпісчыкі! Вы ня думайце, што гэта толькі ў Менску. У правінцыі яшчэ горш: там умеюць толькі два разы ў месяц, а то і адзін раз камплектам дастаўляць. Ды гэта і ня дзіва: там трэба ісьці вёрст дзесяць або дваццаць пехатою. З чалавекам можа што-небудзь здарыцца...

Раскажам мы вам такі факт. Адасланы быў ліст з Магілева ў Мазыр 25 кастрычніка; 26 ён быў на ст. Мазыр, 29 кастрычніка ў г. Мазыр. Як бачыце, 200 кілёмэтраў ён прайшоў за 2 сутак, вядома, чыгункай, а са ст. Мазыр да гораду 4 кілёмэтры, дык ён ішоў 4 сутак, мусіць на валох ехаў; але, ня гледзячы на тое, што і дарога дрэнная, павінны былі і валы дайсьці хутчэй.

Яшчэ адзін факт ужо пра Менск. На самай Менскай пошце, піша Менская паштовая кантора (аддзел падпіскі) ліст у рэдакцыю ад 31 кастрычніка і здае па інстанцыях, каб яго як-небудзь паклалі ў абанэнтную скрынку; у рэдакцыі яго атрымалі 5 лістапада. Як бачыце, на гэта патрэбна было шэсьць дзён. Вы падумаеце, што гэта можа далёка? Не, зусім блізенька—роўна 30 крокаў ад рэдакцыі да пошты, а ўсе лісты з абанэнтнай скрынкі выбіраюцца 2 разы ў дзень.

Дык вось, таварышы-падпісчыкі, мусіць і газэта такім шляхам ідзе і няма чаго дзівіцца, што вы яе позна атрымліваеце. Заадно трэба, таварышы, і яра наступнае спажыць, бо гэта таксама зьяўляецца прычынай позняй дастаўкі газэт: на Менскай пошце ў аддзеле падпіскі працуюць ад 9 да 3 з палов. гадзін, і вось калі з канторы газэты, скажам, не здадуць картак, па якіх рассылаюцца газэты, да 2 гадзін, дык пасьля ня прымаюць, а пакідаюць іх на другі дзень і потым пасылаюць на месца, а як вы ўжо ведаеце пра хуткасьць вашай пошты, дык гэтыя карткі пападаюць на месца праз дзён 5-6, і вы атрымліваеце газэту, скажам за 1-е чысло, прыблізна 7-га або 8-га. Тут вы можаце падумаць, што мы вінаваты, трэба здаваць да 2-й гадзіны, але і тут віна ня наша. Мы атрымліваем простыя лісты а 12 гадзіне, а заказныя і грашовыя пераводы а 1-2 гадзіне, раней ніяк немагчыма атрымаць: кажуць, што ня могуць разабраць пошты раней. Атрымаўшы пошту, мы павінны выканаць усе заказы, выпісаўшы карткі, чаго, вядома, за паўгадзіны зрабіць ніяк немагчыма. Як бачыце, і тут бяда, але ўсё гэта ня так уже страшна. Мы думаем, што як-небудзь дагаворымся в Менскай поштай, каб здзін ці два супрацоўнікі іх на прыходзілі ў 9 гадзін на працу, а гадзіны на дзьве раней, бо ім таксама няма чаго рабіць да 12-й гадзіны.

Як бачыце, колькі прычын неакуратнае дастаўкі. Але мы спадзяёмся, што надалей пошта паправіцца ў дастаўцы газэт і нашаму падпісчыку ня трэба будзе траціць 10-20 кап. на пісьмо скаргі ні адмаўляцца ад падпіскі, як гэта часам бывае.

Гілевіч.

З лістоў рабселькораў.

ПАТРЭБНА ТЛУМАЧЭНЬНЕ.

У Горацкім спажывецкім т-ве «Селянін» (Чэрв. р-н) няма прыросту пайшыкаў, бо ў крамах за выключэньнем „горкай", якая заняла амаль усе паліцы, і некаторай дробязі, як цукеркаў ды люцыну—нічога ня знойдзеш. Хто ў гэтым вінаваты—ці праўленьне т-ва, ці Белкаапсаюз—невядома. Толькі такое становішча ў далейшым можа кепска адбіцца на хлебазагатоўках і росьце пайшыкаў. Некаторыя сяляне ўжо гавораць аб тым, каб забраць свае паі.

Уладз. Юркевіч.

ЦІ ПАЛЕПШЫЦЦА ПРАЦА НАРДОМУ?

Бярэзінскі нардом бывае адчынены ў дзень ня больш 2-х гадзін. За гэты час няма ніякай магчымасьці пачытаць літаратуру. Ёсьць выпадкі, калі нардом бывае зусім на замку. Загадчык нардому т. Янкоўскі вельмі зацікаўлен пастаноўкамі сьпектакляў і кіно і ў якасьці кантралёра вымушан стаяць цэлыя вечары на праверцы білетаў. Насельніцтва скардзіцца і просіць спыніць гэту недарэчнасьць.

У.

ПАБУДАВАЛІ МАСТЫ І ГРЭБЛІ, А АБ СТУДНЯХ НЕ ПАКЛАПАЦІЛІСЯ.

Чэбатовіцкі с.-савет за кошт самаабкладаньня пабудаваў масты, грэблі і грамадзкоды, а пра студні запамятаў. Пасяжкоўцы Нова-Жэзьлянцы хоць і ўхвалялі пабудову апошніх з бэтону, але чамусь-ці даготуль засталіся бяз студняў.

Ці паклопаціцца наш сельсавет аб выкананьні гэтай пастановы і скарыстаньні сродкаў самаабкладаньня на іх прызначэньню цалкам?

Ведаючы.

ВУЛІЦА НЕ АДПАВЯДАЕ СВАЁЙ НАЗВЕ.

На сорам усяму Чэрвеню прыходзіцца гэта сказаць аб Ленінскай вуліцы, якая носіць пачэсную назву, але ня мае ламначкі Ільліча, у той час, як на ўсіх іншых вуліцах гораду пры кожным доме маецца асьвятленьне. Можа Чэрвеньскі гарсавет пастараецца, каб вуліца апраўдала сваю назву?

Гілевіч.

ПАБУДАВАЛІ ТРАТУВАРЫ І ПАД ГРАЗЬЗЮ ПАХАВАЛІ.

Гаенскі с.-савет (Лагойскага р-ну, Меншчына) пабудаваў у сабе на вуліцах тратуары, але не паклапаціўся каб вымасьціць вуліцы і назбаваць іх ад непраладнай гразі—не дадумаўся.

Цяпер грязь затапіла гэтыя тратуары і яны за адно лета згнілі, а каменьня каля Гайны хоць адбаўляй.

ДАЙЦЕ ДОБРЫ ХЛЕБ ЦІ МУКУ!

Кохانскі РВК забараніў мясцоваму спажывецкаму т-ву прадаваць служачым аржаную муку і прапанаваў задавольваць іх патрэбы печаным хлебам, які т-ва выпякае на прыватных пякарнях. Але хлеб не заўсёды бывае добранасны, бо прыватнікі на ім хочуць зарабіць і не выпякаюць, як трэба. Тым часам, з мыцкоў камбінату «некаторыя асобы» маюць магчымасьць атрымоўваць муку. Спажывецкаму т-ву трэба паклапаціцца аб палепшаньні якасьці хлеба, або дабіцца дазволу ад РВК на водпуск мукі.

Ан. Б.

СУД.

Мяшчанскі сорам.

Сын незаможнага земляроба м. Прапойску, Магілеўскай акругі, Фёдар Капанаў ажаніўся з такою-ж, як і сам, бедною батрачкаю Палагеяй Жыхаровай. Праз некаторы час Капанаў пайшоў у Чырвоную армію, адкуль яго, як здольнага хлапца, паслалі ў вайсковую паветраную школу. Выпатрабаваў Капанаў у Маскву і жонку. Нарадзілася ў іх дачка Тамара. Да вучэньня Капанаў быў здольны, і ў чэрвені 1928 г. скончыў школу, атрымаў спэцыяльную адукацыю мэтэоролога і быў назначаны камандзірам у авія-школу ў г. Троцку.

Працуючы ў Маскве, Капанаў дадумаўся, як потым ён прызнаўся суду, што яму, будучаму камандзіру Чырвонай арміі, са спэцыяльнай адукацыяй, соромна мець напісьменную жонку, былую батрачку, чаму ён і намерыўся як-небудзь пазбавіцца яе.

Перад адпраўкаю ў Троцк на службу, Капанаў атрымеў месячны адпачынак, які хацеў скарыстаць у свайго бацькі ў Прапойску, куды і паехаў з жонкаю і паўтарагадовай дачкаю Тамараю. Вось гэтае падарожжа і паказалася Капанаву самым зручным моментам, каб зьдзейсьніць свой намер—пазбавіцца жонкі. Прыехаўшы на ст. Быхаў, Капанаў пайшоў з Палагеяй па беразе р. Дняпра, быццам на хутар, каб наняць фурманку ў Прапойск. Палагея з дзіцем на руках ішла папераздзе. Капанаў ззаду. Калі яны праходзілі па крутому берагу, Капанаў сапхнуў Палагею з дачкаю ў раку. Палагея зразу не ўтанула і стала крычаць. Капанаў скінуў з сябе шынэль і гімнасьёрку, ускочыў у ваду, сханіў Палагею за шыю стаў душыць і кінуў яе на спрадзіну ракі. Было ўжо цёмна і Капанаў быў упэўнены, што Палагея патанула. Апранаўшыся, ён пашоў назад на ст. Быхаў.

Палагея ўмела добра плаваць, дзякуючы чаму яна выбралася на бераг і з гвалтам дабегла ў вайсковы лягер, адкуль яе даставілі ў міліцыю, якая назаўтра раніцою і арыштавала на ст. Быхаў Капанава.

На заўтрашні дзень жыхары в. Прыбор злавілі ў рацэ труп дачкі Капанава,—Тамары.

Магілеўскі акруговы суд прыгаварыў Капанава на 8 гадоў пазбаўленьня волі з суровым адмежаваньнем.

Вярхоўны суд прыгавор зацьвердзіў.

Б.

Апавяшчэньні.

— У сераду, 14-XI, а 7 гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму АК МОПР'у.

Прысутнасьць усіх членаў прэзыдыуму і членаў АК, якія знаходзяцца ў Менску, абавязкова.

Запрашаюцца гар. актывісты.

ПЭДГАБІНЭТ.

— Заўтра, 14-XI, у сераду а 7 гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне сэкцыі палавога выхаваньня ў школе. Запрашаюцца настаўнікі і школьныя ўрачы.

ПЭДГАБІНЭТ.

У чацьвер, 15 лістапада, роўна а 6 гадзіне ўвеч. адбудзецца агульны сход сэкцыі грамадзка-карыснай працы.

Парадак дня:

1. «Грамадзка-карысная праца школы яе неабходнасьць і выхаваўчае значэньне» —даклад т. Панкевіча.
2. Бягучыя справы.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— 13 лістапада роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца зачынены сход ячэйкі КП(б)Б Працасьветы.

ТАПТАНЬНЕ НА МЕСЦЫ.

(«БРОНЕЦЯГНІК»—БДАТ 1).

Перад намі чарговая навінка БДАТ1—„Бронецягнік" Ус. Іванова. П'еса гэта, упяршыню выведзена на сцэну маскоўскім мастацкім тэатрам, адыграла ў яго гісторыі рашаючую ролю. К 30-й яго гадавіне яна завяршыла яго шлях ад чэхаўскай „Чайкі" канца мінулага стагоддзя, праз містычную „Сінюю птицу", праз даволі выразныя «Дни Турбиных» да ідэёва закончанай пастаноўкі п'есы Іванова. Пастаноўка «Бронепоезда» на маскоўскай сцэне была выклікана гістарычнай неабходнасьцю і зусім лёгічна вынікала з усяе лініі тэатру і з тых умоў, якія яго працаю кіравалі. Чарговаю пастаноўкаю маскоўскага мастацкага тэатру будзе, безумоўна, п'еса, прадстаўляючая гістарычны працяг «Бронепоезда», г. зн. п'еса малюючая будаўніцтва пераходнага перыяду.

Мы знарок дазволілі сабе гэты невялічкі экскурс у гісторыю п'есы «Бронепоезд», каб знайсьці хоць якія моманты, якіх-б паказалі месца «Бронецягніка» на новай сцэне. Аднак, пры ўсім жаданьні, мы ўсё-такі ня можам улавіць думку дырэкцыі, якая прывяла яе да пастаноўкі «Бронецягніка» пасьля „Перамогі", «Кар'еры таварыша Брызгаліна», «Зароку» і г. д. Наш тэатр разьвіваўся зусім іншымі шляхамі, чымся ня толькі маскоўскі мастацкі тэатр, але і наогул расійскі. Якраз у тыя самыя гады, калі ў прасторных памяшканьнях мастацкага тэатру праходзілі першыя пробы «Синой птицы», невялічкія групы маладых беларускіх актораў з вялікімі труднасьцямі рыхтавалі першыя беларускія аднаактоўкі для напалову сямейнай аудыторыі. А калі, пасьля рэвалюцыі, беларускі тэатр упяршыню стаў на ногі, дык першаю буйнаю яго пастаноўкаю была пастаноўка „На Кушальле", прасякнутая рамантыкай новага жыцьця, што вырастае на руінах нёманай, прыдушанай, прыгнечанай старой Беларусі. І пасьля гэтай пастаноўкі лінія тэатру доўгі час ішла даволі зразумела і ясна і праца тэатру нібыта накіроўвалася на разьвіцьцё і паглыбленьне самабытнага беларускага тэатральнага мастацтва. І вось цяпер, ці то сапраўды ад рэпэртуарнага голаду, ці то па нездагадлівасьці нашага тэатральнага кіраўніцтва БДАТ1 пачынае гублець сваю лінію і мітусіцца, шукаючы дарогі. Замест таго, каб пасьлядаей лінію ўмацненьня тэатральнай культуры Беларусі, замест таго, каб паклапаціцца аб набыцьці рэпэртуару, які быў-бы дбэгічна зьвязаны з напрэднім шляхам тэатру і адначасна даваў бы поступ наперад, БДАТ1 затаптаўся на месцы наміх „Мацежам", «Вераценам» і «Бронецягніком». У пагоне за перастарэлымі навінкамі маскоўскіх тэатраў, БДАТ1 адыйшоў ад сваёй сапраўднай і настойнай задачы.

Навошта было ставіць „Бронецягнік"? Для завяршэньня шляху тэатру ад набытых у нас „Чаек", «Синих птиц» да «Дней турбиных»? Ці можа яшчэ на якіх вышэйшых мерках-ваньнях? Прынамсі мы ніяк ня